

ШМАТДЗЕТНАЯ СЯМ'Я — ПРА ЖЫЦЦЁ Ў ВЁСЦЫ

Сямейная газета

ЯК ПАЗБАВІЦЦА АД «ЛІЧБАВАГА СІРОЦТВА»?

Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 СНЕЖНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 242 (30122)


КОРАТКА

- Перасовачны ФАП паступіў у Драгічынскі раён.
- ДПК: у чэргах на граніцы з ЕС сабралася больш за тры тысячы фур.
- **Авіярэйсы паміж Мінскам і Мінеральнымі Водамі адновяцца з 13 студзеня.**
- Бізнес Кітая зацікаўлены ў павелічэнні экспарту і імпарту з Беларуссю.
- **Мінэканомікі: узровень самазабеспячэння Беларусі па асноўных групах прадуктаў харчавання перавышае 100 %.**
- БУТБ: біржавы гандаль — адзін з ключавых кірункаў супрацоўніцтва Беларусі і Чалябінскай вобласці.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Іван ТЭРТЭЛЬ, старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі:**

*«Я хацеў бы падкрэсліць, што за апошнія тры гады нічога не памянялася ў плане мэт нашага праціўніка. Проста гэтае супрацьстаянне перайшло ў больш прыхаваную фазу. Мы канстатуем, што Захад у рэалізацыі сваёй канцэпцыі, выпрацаванай раней у дачыненні да Беларусі, зайшоў у тупік. Яны гэта прызнаюць. У цяперашні час тых мэт, якія яны спрабавалі дамагчыся ў найкароткія тэрміны, ім дасягнуць не ўдалося. Санкцыйны ціск у дачыненні да Беларусі не прынёс чаканых вынікаў. Наша дзяржава паспяхова развіваецца, эканоміка працуе. Сур'ёзныя намаганні асабіста Прэзідэнт прыкладае для дыверсіфікацыі. Кіраўнік дзяржавы здзейсніў вельмі плённыя візіты ў Кітай, на Блізкі Усход, у краіны Афрыкі. Праекты намечаны сур'ёзныя, і яны будуць рэалізаваны. Гэта яшчэ раз сведчыць аб тым, што мэты, якія ставіў перад сабой Захад, не былі дасягнуты».*

З першых вуснаў

# «Нам не патрэбны турыстычныя паездкі, нам патрэбны рашэнні канкрэтных пытанняў»

## Дамоўленасці, дасягнутыя падчас замежных камандзіровак кіраўніка дзяржавы, павінны быць выкананы

**Пачатак снежня ў графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі быў поўнасцю прысвечаны міжнароднаму супрацоўніцтву. Беларускі лідар наведаў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Кітайскую Народную Рэспубліку, Экватарыяльную Гвінею і Кенію. Фактычна геаграфія візітаў расцягнулася ад Ціхага да Атлантычнага акіяна. Вынікі гэтых паездак і задачы, якія яны паставілі перад беларускім бокам, разгледзелі на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы.**



Фота БелТА.

«Хацеў бы абмеркаваць вынікі нашых камандзіровак — урадавай дэлегацыі і маіх — па далёкай дузе. Думаю, што і ў людзей, і ў вас сёння не павінна ўзнікаць пытанняў, што такое далёкая дуга», — акрэсліў тэму нарады Аляксандр Лукашэнка. Па словах Прэзідэнта, нядаўнія камандзіроўкі яго самога і ўрадавай дэлегацыі акрэслілі гэтую далёкую дугу, па якой трэба працаваць. Аляксандр Лукашэнка абазначыў, што ў блізкую дугу ўваходзяць краіны — удзельніцы Садружнасці Незалежных Дзяржаў. «Расія і КНР — дзве дзяржавы, з якімі мы маем найбольш развітыя адносіны, — гэта асобная гісторыя. Вы ведаеце, што прыняты і рэалізоўваюцца адпаведныя рашэнні Прэзідэнта асобна па гэтых дзяржавах. А далёкая дуга — вось яна абазначана. Паўночней, паўднёвей размешчаны дзяржавы, якія нас вельмі цікавяць», — падкрэсліў ён.

Асобным пытаннем, на якое пакуль не знаходзіцца прынцыповага рашэння, кіраўнік дзяржавы назваў супрацоўніцтва з Індыяй. Ён нагадаў, што ў свой час колішні міністр замежных спраў Уладзімір Макей пачынаў прынцыпова займацца гэтым пытаннем. «Думаю, што цяперашні міністр замежных спраў унясе свае прапановы ў найбліжэйшы час. Не пазней чым першы квартал будучага года — план работы з Індыяй. Менавіта план, як мы гэта рабілі ў Афрыцы з Экватарыяльнай Гвінеяй. Нам не патрэбны турыстычныя паездкі — нам патрэбны рашэнні канкрэтных пытанняў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. СТАР. 2

Праверана на справе

# «СВЯТЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ ДЛЯ ЎСІХ»

## Як выконваецца даручэнне Прэзідэнта аб напаўненні таварамі вясковых крам



**У канцы лістапада кіраўнік нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даручыў ураду і Адміністрацыі Прэзідэнта забяспечыць неабходны асартымент у гандлёвых аб'ектах малых населеных пунктаў.**

**«Хачу папярэдзіць урад, што скідак ніякіх не будзе ў плане забеспячэння нармальнай сітуацыі ў пераднавагодніх і перадкалядныя святы. Не павінна быць ніякіх праблем з харчаваннем для нашых людзей», — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка. Па словах Прэзідэнта, у краіне ўсяго хапае, праблемы з асартыментам тавараў у вёсках і невялікіх гарадах могуць узнікнуць толькі з-за нераспарадлівасці службовых асоб. «Асабліва — малыя гарады, аграгарадкі і вёскі. Гэта нашы людзі. Гэта небагатыя людзі. Яны павінны ўсім быць забяспечаны. Святы павінны быць не толькі для начальнікаў, жыхароў Мінска і буйных гарадоў. Святы павінны быць для ўсіх», — падкрэсліў беларускі лідар.**

**Уласныя карэспандэнты «Звязды» выехалі ў раёны, каб на свае вочы пабачыць, як выконваецца даручэнне Прэзідэнта.** СТАР. 14-15

Нашы дзеці

# ЦУДЫ СВАІМІ РУКАМІ...

**15 снежня ў Беларусі стартуе традыцыйная дабрачынная акцыя «Нашы дзеці», гісторыя якой налічвае ўжо больш як чвэрць стагоддзя. Задача самай добрай акцыі — акружыць цяплом і клопатам маленькіх жыхароў нашай краіны, у першую чаргу, выхаванцаў дзіцячых дамоў, дамоў сямейнага тыпу, школ-інтэрнатаў, прытулкаў для дзяцей-сірот, дзяцей-інвалідаў, пацыентаў дзіцячых бальніц і рэабілітацыйных цэнтраў, якія асабліва востра маюць патрэбу ва ўвазе ў навагоднія і калядныя дні.**

Старт будзе дадзены ў Белавежскай пушчы ў рэзідэнцыі беларускага Дзеда Мароза 15 снежня ў 11.00.

— Гэта новы фармат адкрыцця акцыі, — паведаміў **начальнік галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Віктар ДОЎНАР.** — У Белавежскую пушчу будуць запрошаны дзеці з усіх рэгіёнаў краіны. Таксама будзе магчымасць удзелу ў адкрыцці і ў анлайн-рэжыме. Адна пляцоўка свята будзе цэнтральнай — у Белавежскай пушчы, але ў кожным рэгіёне, у тым ліку ў сталіцы (на базе Мінскага дзяржаўнага палаца дзяцей і моладзі), арганізуюць свае пляцоўкі, адкуль будуць весціся прамыя ўключэнні. СТАР. 2

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месячны.



# «Нам не патрэбны турыстычныя паездкі, нам патрэбны рашэнні канкрэтных пытанняў»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вялікую ўвагу на нарадзе ўдзялілі краінам Афрыканскага кантынента. «Я хачу ўсіх папярэдзіць. Віцэ-прэм'ераў я запрасіў, хоць яны і не былі паглыбленыя ў дэталі гэтых падрыхтоўчых візітаў нашых спецыялістаў, міністраў. Яны ведаюць гэта. Я вас запрасіў для таго, каб вы ўзялі на асаблівы кантроль вынікі гэтых камандзіровак, — сказаў Прэзідэнт. — З Экватарыяльнай Гвінеяй мы працавалі па-новаму. Усё пад маім жорсткім кантролем. Там пабываў міністр замежных спраў, усталяваў кантакты з гэтай дзяржавай. Там спецыялісты працавалі. І міністры напярэдадні майго візіту, наведаўшы гэтую краіну, выпрацавалі асноўныя кірункі (іх 15) нашай работы з Экватарыяльнай Гвінеяй і 74 канкрэтныя праекты, якія мы дамовіліся ажыццявіць з нашымі сябрамі ў Экватарыяльнай Гвінеі. Іх трэба рэалізаваць. Я катэгарычна на гэтым настойваю і папярэджваю». Ён даручыў памочніку Прэзідэнта Аляксандру Косінцу ўзяць на кантроль у Адміністрацыі Прэзідэнта рэалізацыю дамоўленасцяў у рабоце з Экватарыяльнай Гвінеяй і Кеніяй. «Гэта тут, у Адміністрацыі Прэзідэнта, павінна быць на кантролі, каб не было, як у нас часам бывае, што мы праводзім рэвізію нашых адносін з тымі ці іншымі дзяржавамі, нешта выключаем, нешта дадаём. Мы дамовіліся — і нам трэба рэалізоўваць гэтыя праекты, — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка. — Я шчыра падкрэсліў там, што гэта не дабрачынная дапамога. Мы не Амерыка, якая друкуе грошы. Мы не Кітай, у якога вялізная колькасць рэзерваў. І нават не Расія. Мы павінны дамаўляцца, за грошы выключна добрасумленна працаваць. Там вельмі добрая перспектыва. Там патрэбна ўсё, што мы ўмеем рабіць».

Супрацоўніцтва Беларусі з Кеніяй будзе на асаблівым кантролі Віктара Шэймана. «Я вам ужо гаварыў у час палёту: вазьміце і займайцеся Афрыкай, як калісьці вы пачыналі. Яна павінна быць пад кантролем у вас як спецыяльнага пасланніка Прэзідэнта. Па Кеніі вы ведаеце пытанні, па якіх нас папрасіў Прэзідэнт дапамагчы ім: тры глабальныя выгадныя для нас пытанні. Ну і іншыя. Таму Афрыка і Кенія асобна — гэта ваша пытанне. Афрыканскі кантынент. Вы пачыналі там, вы за яго адказваеце», — звярнуўся да яго Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заявіў, што за супрацоўніцтва з Кітайскай Народнай Рэспублікай асабістую і персанальную адказнасць нясе віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў, які разам з кіраўніком МЗС прысутнічаў на перагаворах беларускага і кітайскага лідараў. «Не» — не было чуваць такога слова. На ўсе пытанні, якія мы паставілі перад Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам, атрымалі адзін адказ: «Так, мы гатовы паглыбляцца, давайце па-сяброўску працаваць». Гэты візіт быў вельмі прадукцыйны і карысны для нашай краіны. Не хачу вам расказваць, што такое Кітай. Кітай — гэта будучыня ўсёй планеты. І тое, што ў нас з імі добрыя адносіны, — гэта наш плюс, наша дасягненне», — сказаў Прэзідэнт.

Кажучы пра супрацоўніцтва з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, беларускі лідар заўважыў, што яны працуюць з беларускім бокам па асобных пытаннях. І нідзе няма тармажэння, ніхто не крыўдзіцца. «Мы дамаўляліся, што, магчыма (у іх вельмі вялікі інтарэс), мы можам разам працаваць у Афрыцы. Там вялікі кавалак работы для Эміратаў. Маю на ўвазе іх уплыў у свеце і тыя фінансавыя рэсурсы, якія ў іх ёсць. Таму, калі ў іх будзе інтарэс па асобных пытаннях працы, — мы гатовыя іх падключаць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён падкрэсліў, што ўсе пытанні супрацоўніцтва з іншымі краінамі павінны быць сканцэнтраваны ў Міністэрстве замежных спраў. «Паглядзім, як новы міністр замежных спраў справіцца з гэтымі пытаннямі. Гэта вялізная колькасць пытанняў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён папярэдзіў урад і міністраў, што пры рэалізацыі дамоўленасцяў з замежнымі партнёрамі не павінна быць ніякага тармажэння, а ўвесь комплекс пытанняў, звязаных з міжнародным супрацоўніцтвам, павінен быць рэалізаваны.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ У тэму

**Прэс-сакратар Прэзідэнта Наталля ЭЙСМАНТ** у размове з журналістамі адзначыла: «Прэзідэнт сабраў нараду, каб без найменшага прамаруджвання, літаральна імгненна ўрад і іншыя службовыя асобы пачалі рэалізацыю тых дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты ў ходзе праведзеных важных замежных перагавораў. Камандзіроўка была вельмі насычаная і цяжкая. Ніколі Прэзідэнт не адлятаў з краіны так надоўга. Інтэнсіўнасць сустрэч, перагавораў, пералётаў усе бачылі. Ад Ціхага акіяна да Атлантыкі, як сказаў кіраўнік дзяржавы».

У выніку траекторыя працы на далёкай дузе вымалёўваецца прадметна і далягляды вельмі добрыя. «Афрыка якраз адзін з самых перспектыўных напрамкаў. Прэзідэнт настройвае ўсіх на інтэнсіўную работу з высокім тэмпам і такой жа прадукцыйнасцю», — расказала Наталля Эйсмант.

У супрацоўніцтве з Кітаем, як адзначыў Прэзідэнт, праблем няма. «Гэта наш стратэгічны партнёр, з якім мы супрацоўнічалі, супрацоўнічаем і будзем супрацоўнічаць», — заявіла прэс-сакратар.

Вялікая ўзаемная цікавасць ёсць і з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі. Не толькі ў двухбаковым фармаце, але і, як абазначыў кіраўнік дзяржавы, размова ідзе аб магчымай сумеснай рабоце ў Афрыцы.

Абмеркавалі на нарадзе і перагаворы ўрадавай дэлегацыі ва Узбекістане і В'етнаме. Падрабязна аб выніках паездкі далажыў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка. «Што датычыцца беларуска-ўзбекскіх адносін — аб канкрэтных планах і праектах. А в'етнамскі напрамак мы, можна сказаць, рэанімуем. Абодва бакі да гэтага гатовы», — падзялілася падрабязнасцямі прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы.

Асаблівы акцэнт падчас нарады Прэзідэнт зрабіў на тым, што актыўна ўключыцца ў работу павінны віцэ-прэм'еры. Не меншую актыўнасць кіраўнік дзяржавы патрабуе і ад паслоў, і МЗС у цэлым. «Наогул жа вынікі падведзены, задачы пастаўлены, зоны адказнасці размеркаваны. Ніякага тармажэння — гэта галоўны тэзіс і патрабаванне Прэзідэнта», — падкрэсліла Наталля Эйсмант.

# ЦУДЫ СВАІМІ РУКАМІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вышэйшыя службовыя асобы краіны, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных ураду Беларусі, канцэрнаў, банкаў, буйных рэспубліканскіх прадпрыемстваў, грамадскіх аб'яднанняў ужо пацвердзілі свой удзел у акцыі, якая будзе доўжыцца да 15 студзеня. Мэта — стварыць свята для кожнага дзіцяці. Усяго рознымі мерапрыемствамі плануецца ахапіць па краіне больш за адзін мільён дзяцей.



У рамках акцыі «Нашы дзеці» пройдзе таксама збор сродкаў, якія потым накіруюць на дыягностыку і лячэнне дзяцей з нейрабластомай.

Юныя мінчане атрымаюць у рамках «Нашы дзеці» больш як 55 тысяч падарункаў ад Мінгарвыканкама. Падарункавыя наборы ім уручаць на мерапрыемствах, якія пройдуць ва ўсіх раёнах сталіцы. Іх закупілі за кошт сродкаў гарадскога бюджэту для дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна неабароненым становішчы, дзяцей са шматдзетных, апякунскіх сем'яў і інш.

Гарадская акцыя «Нашы дзеці» адкрыецца 15 снежня таксама ў новым фармаце, на канькабежным стадыёне «Мінск-Арэна», дзе для дзвюх тысяч хлопчыкаў і дзяўчынак падрыхтавана лядовае шоу — маштабны тэатралізаваны паказ.

Найлепшых старшакласнікаў мінскіх школ і гімназій 26 снежня збярэ традыцыйны гарадскі баль у Палацы дзяцей і моладзі. 29 снежня адбудуцца тэатралізаваны навагодні паказ у Беларускім дзяржаўным цырку з удзелам кіраўніцтва горада.

Ёлкі з удзелам губернатараў пройдуць ва ўсіх рэгіёнах. На рэспубліканскім узроўні пройдзе навагодняя ёлка з удзелам кіраўніка дзяржавы, якая збярэ 2,5 тысячы дзяцей — не толькі прадстаўнікоў сацыяльна ўразлівых груп, але і школьнікаў, якія дасягнулі значных поспехаў у вучобе, творчасці, спорце, грамадзянскіх актывістаў. А ў Палацы Незалежнасці адбудзецца традыцыйны навагодні баль з удзелам 350 навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі.

Паралельна з дабрачыннай акцыяй у краіне для дзяцей разгорнецца акцыя «Ад усёй душы», накіраваная на людзей «залатога» ўзросту.

«Упершыню акцыя была праведзена ў 2023 годзе па ініцыятыве кіраўніка дзяржавы. Бясспрэчна, у нас усё найлепшае — дзецям, але мы не павінны забывацца і пра людзей старэйшага ўзросту, якія сёння таксама маюць патрэбу ў асаблівым клопаце і ўвазе, — падкрэслівае **начальнік галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Кацярына КАЛЯДА.** — Самы актыўны ўдзел у гэтых мерапрыемствах прыме наша моладзь — школьнікі і студэнты».

У рамках падрыхтоўкі да свят ужо запусцілі эстафету «Навагодні настрой». «Святочны настрой — гэта ў першую чаргу стварэнне адмысловай атмасферы, упрыгожванне і афармленне нашых устаноў сацыяльнага абслугоўвання, дзе пражываюць адзінокія пажылыя грамадзяне: тэрытарыяльных цэнтраў, дамоў-інтэрнатаў, бальніц сястрынскага догляду, хоспісаў, — патлумачыла Кацярына Каляда. — Наступны важны момант — стварэнне навагодняй атмасферы дома ў пажылых грамадзян і інвалідаў. Тут актыўны ўдзел прыме моладзь, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, нашы партнёры. Мы гатовы не толькі расчысціць снег, але і дапамагчы прынесці ёлку, упрыгожыць яе, даставіць прадукты для арганізацыі святочнага стала і нават дапамагчы нарэзаць салаты. Усе пажаданні, усе запатрабаванні нашага старэйшага пакалення будуць задаволены агульнымі сіламі. Да гэтай эстафеты могуць далучыцца ўсе ахвотныя. Інфармацыя аб тэрытарыяльных цэнтрах, дамах-інтэрнатах размешчана на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, на сайтах абласных камітэтаў. Але адзінокія людзі жывуць і побач з намі. Нельга спасылацца на пастаянную занятасць. Наступаюць дні, калі кожны з нас можа рабіць цуды сваімі рукамі».

Буйныя ўрачыстыя мерапрыемствы падчас акцыі пройдуць 3 студзеня на абласным узроўні і ў Мінску. У сталіцы, напрыклад, рыхтуемся да свята ў Вялікім тэатры оперы і балета.

«Не застануцца без асаблівай увагі і доўгажыхары, а таксама тыя, у каго да 15 студзеня пройдуць дні нараджэння. Мы пастараемся зрабіць гэтыя дні яркімі і незабыўнымі», — адзначыла прадстаўнік Міністэрства працы.

Скарбонку добрых спраў дабрачынных акцый «Нашы дзеці» і «Ад усёй душы» папоўняць мерапрыемствы цімураўскага руху Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі і валанцёрскага руху «Добрае сэрца» БРСМ. Аб гэтым расказала **сакратар ЦК БРСМ і старшыня Цэнтральнага савета Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі Аляксандра ГАНЧАРОВА:**

— 15 снежня стартуе наша традыцыйная акцыя «Цуды на Калядны». Яе сімвал — чырвоныя рукавічкі — упрыгожыць усе святочныя дабрачынныя праграмы. Дзеці будуць наведваць з інтэрактыўнымі праграмамі сацыяльныя ўстановы. Апошнім часам папулярнасцю карыстаецца такая форма супрацоўніцтва, як рэтракіназала, калі маладыя людзі разам са старэйшым пакаленнем глядзяць старыя кінастужкі, а потым іх абмяркоўваюць. Толькі па лініі БРСМ запланавана больш як 300 мерапрыемстваў. Ключавой падзеяй стане Усебеларуская піянерская ёлка, якая збярэ 400 хлопцаў і дзяўчат — пераможцаў праектаў і праграм акцыябрацкага і піянерскага руху. Плануецца, што да іх далучацца госці з Расіі і Узбекістана.

Гэтымі днямі ў БРСМ працуюць гарачыя лініі, на якія могуць звярнуцца па дапамогу людзі старэйшага ўзросту. За лістапад — снежань паступіла каля 700 зваротаў з просьбай скласці дровы, прыбраць снег, даставіць прадукты, дапамагчы з уборкай. У мерапрыемствах былі задзейнічаны больш як тры тысячы цімураўцаў і валанцёраў.

На думку Аляксандры Ганчаровай, добрых спраў шмат не бывае. Усе мы чакаем навагоднія святы, але можам і самі стварыць свята для іншых...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# АД ДАБРАБЫТУ КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА — ДА ПАСПЯХОВАГА РАЗВІЦЦЯ ДЗЯРЖАВЫ

## Сенатары зацвердзілі бюджэтна-падатковыя дакументы на будучы год, а таксама адобрылі іншыя важныя законапраекты

**Падчас чарговага пасяджэння адзінаццатай сесіі Савета Рэспублікі прыняты законапраекты «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2024 год» і «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання». Раней быў зацверджаны праект Закона «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2024 год». Такім чынам, работа абедзвюх палат парламента над галоўнымі фінансавымі дакументамі краіны на будучы год завершана — цяпер яны будуць накіраваны на разгляд кіраўніку дзяржавы.**

### Павышэнне заробку і адзіны маёмасны плацеж

У 2024 годзе даходы рэспубліканскага бюджэту плануюцца ў памеры 39 906,4 млн рублёў, кансалідаванага бюджэту — 67 526,8 млн рублёў, што адпаведна на 2,8 % і 6,3 % больш, чым ацэнка паступленняў 2023 года. Расходы рэспубліканскага бюджэту ў будучым годзе плануюцца ў суме 44 657,4 млн рублёў, кансалідаванага бюджэту — 72 679,6 млн рублёў, або 113,9 % і 112,1 % адпаведна да ацэнкі мінулага года.

Прыярытэтнымі кірункамі бюджэтнай палітыкі ў наступным годзе застаюцца сацыяльная сфера, павышэнне дабрабыту грамадзян за кошт павелічэння памеру заработнай платы, падтрымка нацыянальнай эканомікі ва ўмовах, якія існуюць. У прыватнасці, у расходах рэспубліканскага бюджэту на 2024 год прадугледжаны сродкі на выплату сямейнага капіталу — 382,5 млн рублёў, фінансаванне будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай — 1,7 млрд рублёў.

Што датычыцца падатковых змяненняў, прадугледжваецца індэксацыя ставак падаткаў з улікам інфляцыйных працэсаў, адмена асобных малаэфектыўных падатковых ільгот, выдзяленне падатковага выліку выпускнікам устаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі, накіраваных на работу па размеркаванні, — у памеры мінімальнай заработнай платы на тэрмін да сямі гадоў.

«Змяненні ў Падатковы кодэкс накіраваны на павелічэнне даходаў бюджэту і стварэнне большай сацыяльнай справядлівасці ў грамадстве, — адзначыў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Валянцін БАЙКО.** — Адбываецца індэксацыя зямельнага і экалагічнага падаткаў у сярэднім да 107,5 %, мяняецца стаўка падаходнага падатку з 13 % да 25 % на звышдаход. Калі даход у грамадзян складзе больш чым 200 тысяч рублёў у год, будзе выплачвацца падаходны падатак у памеры 25 %. Павялічваецца падатак на прыбытак для арганізацый, якія атрымліваюць больш чым 25 мільёнаў рублёў у год. Такіх арганізацый у нас у краіне каля 155 з 38 тысяч. Калі індывідуальныя прадпрымальнікі атрымліваюць даход звыш 500 тысяч у год, стаўка падаходнага падатку складзе 30 %. Уводзіцца падатак на люксавыя аўтамабілі з коштам больш як 100 тысяч долараў, з года выпуску якіх прайшло не больш за тры гады». Пры гэтым стаўка падатку на транспартныя сродкі павышанай камфортнасці будзе павялічана ў дзесяць разоў.

Уводзіцца паняцце «адзіны маёмасны плацеж», які ўяўляе сабой агульную суму падатку на нерухомую маёмасць, зямельнага падатку і транспартнага падатку і будзе выплачвацца фізічнай асобай на адзін рахунак рэспубліканскага бюджэту.

### Адстойванне нацыянальных інтарэсаў і клопат аб бяспецы

Адобрылі сенатары і праект Закона «Аб спыненні міжнародных дагавораў па пытаннях барацьбы з карупцыяй». Дакумент падрыхтаваны з мэтай дэнансацыі Рэспублікай Беларусь Канвенцыі аб крымінальнай адказнасці за карупцыю, Дадатковага пратакола да Канвенцыі аб крымінальнай адказнасці за карупцыю, Канвенцыі аб грамадзянска-прававой адказнасці за карупцыю, спынення дзеяння Пагаднення паміж Рэспублікай Беларусь і Саветам Еўропы адносна прывілей і імунітэтаў прадстаўнікоў членаў Групы дзяржаў супраць карупцыі (ГРЭКО) і членаў інспекцыйных груп, а таксама выканання ўнутрыдзяржаўных працэдур для спынення ўдзелу Рэспублікі Беларусь у ГРЭКО.

Як адзначыў **Генеральны пракурор Андрэй ШВЕД**, не з'яўляючыся членам Савета Еўропы, Рэспубліка Беларусь добраахвотна прыняла на сябе абавязацельствы па ўдзеле ў механізмах агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва па пытаннях барацьбы з карупцыяй. «Акрамя таго, наша краіна падпісала Пагадненне з Саветам Еўропы і са студзеня 2011 года стала членам ГРЭКО (Групы дзяржаў супраць карупцыі), — заўважыў кіраўнік ведамства. — Генеральная пракуратура ва ўзаемадзеянні з іншымі зацікаўленымі органамі і арганізацыямі прыкладала неабходныя намаганні па выкананні дадзеных рэкамендацый, накіроўвала адпаведную інфармацыю ў выканкам ГРЭКО. Разам з тым многія рэкамендацыі насілі палітычны характар і патрабавалі ўнясення змяненняў у Канстытуцыю і нацыянальнае заканадаўства, што з'яўляецца непрымальным. ГРЭКО нашы довады аб немагчымасці рэалізацыі патрабаванняў, якія прад'яўляліся, не ўспрымала, пастаянна крытыкавала нашу краіну за незадавальняльны, па іх меркаванні, узровень выканання рэкамендацый».

Праект Закона «Аб змене законаў па пытаннях барацьбы з тэрарызмам», за які прагаласавалі члены Савета Рэспублікі, накіраваны на павышэнне эфектыўнасці мер па папярэджанні, выяўленні і спыненні актаў тэрарызму. У прыватнасці, органы дзяржаўнай бяспекі надзяляюцца кампетэнцыяй па каардынацыі дзейнасці суб'ектаў, якія непасрэдна ажыццяўляюць барацьбу з тэрарызмам (за выключэннем Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), іншых дзяржаўных органаў і іншых арганізацый у частцы рэалізацыі імі сваіх паўнамоцтваў у галіне барацьбы з тэрарызмам. Служба інкасацыі будзе працягваць да аховы аб'ектаў, суправаджэння і забеспячэння бяспекі фізічных асоб і транспартных сродкаў у зоне правядзення контртэрарыстычнай аперацыі.

### Таварыствы ўласнікаў — па новых правілах

Сенатары адобрылі законапраект, які даўно чакалі грамадзяне, — «Аб змяненні законаў па пытаннях кіравання жыллёвым фондам і яго эксплуатацыі». Удакладняецца паняційны апарат у адносінах да арганізацый забудоўшчыкаў (жыллёвых і жыллёва-будаўнічых спажывецкіх кааператываў), якія змогуць ствараюцца толькі на базе аднаго шматкватэрнага жылога дома. Устанаўліваецца адзіны парадак акумулявання грашовых сродкаў плацельшчыкаў на капітальны рамонт жылых дамоў на спецыяльных рахунках мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў для іх мэтавага выкарыстання. Урад надзяляецца паўнамоцтвамі па вызначэнні парадку атэстацыі суб'ектаў гаспадарання, якія эксплуатуюць жыллёвы фонд і (або) аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі. Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам даецца права ануляваць пасведчанне аб праходжанні прафесійнай атэстацыі старшыні праўлення арганізацыі ўласнікаў, прызначаць упаўнаважаную асобу для кіравання агульнай маёмасцю сумеснага домаўладання ў выпадках анулявання такога пасведчання або спынення тэрміну яго дзеяння, а таксама прымаць рашэнне аб ліквідацыі арганізацыі ўласнікаў. Для грамадзяніна ўстанаўліваецца абмежаванне на займанне пасады старшыні праўлення толькі ў адной арганізацыі ўласнікаў.

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** паведаміла, што гэты законапраект некалькі разоў разглядаўся на экспертным савеце. Яна расказала, што ні адзін прыём грамадзян не абыходзіцца без скаргаў на работу таварыстваў уласнікаў. Таму, па словах спікера верхняй палаты парламента, тыя новаўвядзенні, якія прапаноўваюцца ўрадам, на дадзены момант з'яўляюцца аптымальнымі.

### Дадатковыя землі і клопат аб прыродзе

Праектам Закона «Аб змене Закона Рэспублікі Беларусь «Аб меліярацыі зямель» удакладняецца паняційны апарат, а таксама ўводзяцца новыя тэрміны і іх вызначэнні для выключэння праблемных пытанняў пры бюджэтным фінансаванні мерапрыемстваў у галіне меліярацыі зямель. Мінсельгасхарч надзяляецца паўнамоцтвамі па арганізацыі правядзення навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ, каардынацыі дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання і арганізацый у галіне меліярацыі зямель. Удасканальваюцца падыходы адносна планавання меліярацыйных мерапрыемстваў з улікам вынікаў інвентарызацыі меліярацыйных сістэм, якая праводзіцца адзін раз на пяць гадоў, і іншае.

Унесены змяненні ў заканадаўства «Аб ахове азонавага слою» і «Аб абыходжанні з адходамі». Як звярнуў увагу **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ,** тая кліматычная павестка, агучаная кіраўніком дзяржавы ў Дубаі, у нашай краіне не словы, а канкрэтныя справы. Аб гэтым сведчыць блок прыродаахоўных дакументаў, разгледжаны парламентарыямі. «Закон «Аб меліярацыі зямель» вельмі неабходны сёння, асабліва для сяльчан, — удакладніў старшыня камісіі. — Ужо дзясятак гадоў кіраўнік дзяржавы выказвае заклапочанасць аб уцягванні ў абарот меліярацыйных земляў, якія павінны прыносіць аддачу. Гэта дадатковыя кармы, збожжа, прадукцыя жывёлагадоўлі — а значыць, валюта».

Таксама сенатары адобрылі змяненні, якія закрануць заканадаўства аб дарожным руху, дзейнасці рэлігійных арганізацый, дзяржаўных узнагародах, ліцэнзаванні. Ратыфікаваны шэраг міжнародных пратаколаў і пагадненняў.

**Вераніка КАНЮТА.**

# Беларусь — Турцыя: развіваючы эканоміку, глядзець шырэй

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Турэцкай Рэспублікі Мустафой АЗДЖАНАМ з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі ў Беларусі.**



Фота БелТА.

«Турцыя для Беларусі — дружалюбная дзяржава. На сёння паміж нашымі краінамі няма сур'ёзных праблемных пытанняў, — сказаў ён. — Мы бачым і ведаем, што Турцыя праводзіць незалежную і ўзважаную знешнюю і ўнутраную палітыку. Яна пераклікаецца з палітыкай, якая праводзіцца кіраўніком беларускай дзяржавы», — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Спікер заўважыў, што ў 2021 і 2022 гадах таваразварот паміж Беларуссю і Турцыяй складае больш за мільярд долараў. «У бягучым годзе па выніках студзеня — кастрычніка мы бачым павелічэнне таваразвароту на 22,7 працэнта да аналагічнага перыяду 2022 года. Мы ўпэўненыя, што гэта тэндэнцыя захаваецца. Больш за тое, мы зможам дасягнуць большай збалансаванасці ў нашых таварных патоках», — падкрэсліў ён. Асобна Уладзімір Андрэйчанка адзначыў значнасць дзелавых кантактаў. Па словах спікера, Турцыя аказала Беларусі неацэнную паслугу ў падтрыманні бізнесу шляхам прадастаўлення існуючай фінансавай і транспартна-лагістычнай інфраструктуры. «Неабходна давесці да канкрэтных вынікаў дасягнутыя дамоўленасці аб праектах у нафтахіміі, аўтамабіле- і трактарабудаванні, аб павелічэнні аб'ёмаў супрацоўніцтва ў сферы транспартных, тэлекамунікацыйных, турыстычных, адукацыйных паслуг. І, вядома ж, будзем развіваць на пляцо Турцыі ў галіне ўзаемных разлікаў паміж суб'ектамі гаспадарання дзвюх краін праз турэцкія банкі. У гэтым пытанні патрабуецца прыняцце неадкладнага рашэння», — заўважыў Уладзімір Андрэйчанка. Пры гэтым, па яго словах, развіваючы эканоміку, трэба не губляць і іншыя кірункі: пытанні адукацыі, аховы здароўя, культуры, турызму, маладзёжных абменаў.

У сваю чаргу, Мустафа Азджан прызнаўся, што яму няпроста з'язджаць з краіны, якую палюбіў. Ён падкрэсліў, што чатыры гады яго работы ў Беларусі прайшлі вельмі добра. «Ёсць важны фактар, які дазваляе нам выбудоўваць двухбаковыя адносіны так вынікова і такім цудоўным чынам. Гэта тое, што мы з'яўляемся міралюбівымі краінамі. Для нас мір і ўсе намаганні, накіраваныя на прыярытэт міру, з'яўляюцца галоўнымі. Мы заўсёды верым і выказваем агульную пазіцыю наконт таго, што мір у пытаннях рэгіянальных і глабальных павінен быць прыярытэтам, неабходна да яго імкнуцца. І прыемна адзначыць у гэтым кантэксце пэўныя вынікі, вельмі значныя для нас», — сказаў пасол.

Вялікі ўклад у развіццё трывалых адносін Беларусі і Турцыі ўносіць і сумесная праца парламентарыяў абедзвюх краін. Вядзецца актыўная работа паміж групамі дружбы па абмене вопытам работы паміж камісіямі, праводзяцца анлайн-сустрэчы і ўзаемныя візіты. **Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах, кіраўнік рабочай групы па супрацоўніцтве з Парламентам Турэцкай Рэспублікі Андрэй САВІНЫХ** адзначыў высокі ўзровень узаемаразумення Беларусі і Турцыі і на ўзроўні парламента. Ён прывёў прыклад, які гэта красамоўна пацвярджае: «Мы часта падтрымліваем адзін аднаго на разнастайных шматбаковых пляцоўках. Зусім нядаўна, дзякуючы пазіцыі Беларусі і Турцыі, былі заблакіраваны змяненні правіл працэдуры Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Мы абаранілі, па сутнасці, кансэнсусны характар прыняцця рашэнняў у гэтай арганізацыі».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# У РЭЖЫМЕ ФАБРЫКІ ДЗЕДА МАРОЗА

## Як у расійскай глыбінцы выпрацоўваюць беларускія цацкі «Палессе»

**«Усе пісьмы, якія дзеці пішуць Дзеду Марозу, той перасылае да нас, і мы забяспечваем выкананне гэтых пажаданняў», — жартуе дырэктар ТАА «Палессе ДГ» Вячаслаў ГНУТАЎ, тлумачачы, што з кастрычніка да снежня прадпрыемства працуе ў рэжыме фабрыкі галоўнага казачнага персанажа Новага года. У асартыменце вытворцы, размешчанага ў невялікім горадзе Дзімітраўградзе Ульянаўскай вобласці, — каля тысячы найменняў цацак, якія пастаўляюцца ў 55 краін свету, а ўсе тэхналогіі распрацоўваюцца, між іншым, у беларускім Кобрыне, на галаўным прадпрыемстве «Палессе». Як беларускія цацкі, якія маюцца, бадай, у кожнай сям'і, вырабляюць у расійскай глыбінцы, журналісты паглядзелі падчас прэс-тура, арганізаванага пры садзейнічанні Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы і Міжнароднай медыягрупы «Россия сегодня».**



Прадпрыемства ў расійскім Дзімітраўградзе з'явілася ў 2019 годзе на тэрыторыі індустрыяльнага парка «Майстар», сёння яно займае 28 тыс. кв метраў.

— Усе тэхналогіі беларускія, бо распрацаваны мацярынскай кампаніяй «Палессе Кобрын», якая была арганізавана 25 гадоў таму і за гэты час ператварылася ў міжнародную групу кампаній. Тэхналогіі былі перададзены ў 2019 годзе, і ў адпаведнасці з гэтымі стандартамі мы арганізоўвалі вытворчасць, — расказвае Вячаслаў Гнутаў.

Летась тут было выраблена каля трох мільёнаў цацак на 570 мільёнаў расійскіх рублёў, і сёлета будзе не менш. У мінулым годзе ТАА «Палессе ДГ» стала найлепшым экспарцёрам Ульянаўскай вобласці сярод суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Самая вялікая частка адгрузак прыпадае на пераднавагодні час.

— У цацках ёсць ярка выяўленая сезоннасць. У нас абавязкова набываюць дзецям падарункі ў двух выпадках — на дзень нараджэння і Новы год. Таму цяпер у нас самая гарачая пара ў частцы адгрузак, — адзначае кіраўнік прадпрыемства.

Нягледзячы на наяўнасць санкцый, многія партнёры, у тым ліку еўрапейскія, не адмовіліся ад прадукцыі фабрыкі цацак. Яна пастаўляецца ў Польшчу, Германію, Японію, Чылі, Бразілію, Аўстралію, Кот-д'Івуар — усяго 55 краін.

Прычым у кожнай краіне ў дзяцей свае перавагі. Будаўнічыя наборы, бетонамяшалкі, каскі і масцяркі — усё, што звязана з будаўнічай тэматыкай, папулярнае ў Польшчы. У дзяцей у Расіі і Беларусі крыху іншыя запыты. Найбольшай папулярнасцю карыстаюцца машынкі і наборы механіка, а таксама наборы доктара.

А ў цэлым самай папулярнай з'яўляецца цацка, з якой пачыналася беларускае «Палессе», — пірамідка з колцамі. У топ-пяць па папулярнасці — каталкі, наборы для гульняў з вадой і пяском «Водны свет», бразготкі, канструктар.

Прадпрыемства вырабляе каля 50 відаў канструктараў. Асабліва тут ганарацца канструктарам «Палессе максі», які нічым не адрозніваецца ад «Лега». У хуткім часе ў канструктары «Палессе максі» з'явяцца наборы па матывах любімых мультфільмаў «Прастаквашына» і «Тры каты».

— Мы ў працэсе перагавораў з расійскімі праваўладальнікамі анімацыйных вобразаў «Саюзмультфільм» і СТС «Тры каты», плануем да канца года заключыць дагаворы, прычым мацярынская кампанія з імі ўжо працуе, і будзем выпускаць прадукцыю з расійскімі анімацыйнымі вобразамі, — дзеліцца Вячаслаў Гнутаў.

Яшчэ адзін праект «Палессе ДГ» — кааперацыя з айчыннымі прамысловымі брэндамі, што будзе садзейнічаць іх папулярызацыі. Ён ужо таксама актыўна рэалізоўваецца ў Беларусі сумесна з прамысловымі гігантамі «БЕЛАЗ», «МАЗ», «МТЗ», «Гомсельмаш» «Амкадор». Вырабляюць цацкі пад таварнымі знакамі гэтых кампаній, якія паўтараюць да пазнавальнасці ўзоры прамысловай тэхнікі. Цяпер такая ж работа вядзецца з «КАМАЗам». У планах — заключыць аналагічныя пагадненні з «Растсельмашам», «Масквічом» і «Расатамам».

— Кожны новы аўтамабіль КАМАЗ, які будзе выпускацца кампаніяй, укамплектуюць цацачным аналагам, і тата-кіроўца, якому на прадпрыемстве ўручылі новы аўтамабіль, прынясе новую цацку свайму сыну. Дзіця з ранняга ўзросту будзе ведаць айчынныя брэнды, а магчыма, і марыць стаць кіроўцам КАМАЗа ці МАЗа, — распавядае Вячаслаў Гнутаў.

**Алена КРАВЕЦ, фота аўтара.**

## Па сутнасці

# ШЛЯХ У ЭЛІТУ



**Ёсць вельмі трапны выраз: «не колькасцю, а ўменнем». І насамрэч у развіцці кожнага прадпрыемства, кожнай галіны, кожнай краіны ёсць свой шлях, канцэпцыя. Самая блізкая з магчымых, самая прыдатная з абраных. Беларусь — сярэдняя па памерах краіна. Насельніцтва — не як у Кітая альбо Індыі. Таму колькасцю дэталяў мы не здужаем пакарыць сусветны гандаль. Вядома ж, чым больш аднатыпнай прадукцыі, тым яна таннейшая. У нас няма лясных абшараў сібірскай тайгі альбо неаглядных прастораў жытнёвай Кубані. Таму гандляваць сыравінай — артыкул, які вялікага прыбытку не прынясе.**

Канешне, у нас ёсць і лес, і ўрадлівыя глебы, але больш сціплыя па памерах. А яшчэ у нас ёсць людзі — сціплыя і здольныя. У суме атрымліваецца: наша ніша — гэта якасць. Інакш нельга. Таму і 2024-ы — Год якасці. Дарэчы, з якасцю мы вельмі даўно сябруем. Спытайце ў кожнага пакупніка з братэрскай Расіі. Брэнды Беларусі — Лукашэнка, парадак, прадукты. Ад Калінінграда да Уладзівастока — усе гэтыя рэкламныя білборды з іншаземнымі таварамі блякнуць у параўнанні са сціплым, але прывабным надпісам: «Товары с Белоруссии». Ды яшчэ і на чырвона-зялёным фоне.

«ГОСТы» замест няякаснага падабенства — гэта рашэнне нашага Прэзідэнта. Менавіта жыццё і здароўе людзей важнейшыя за прыбытак. Таму прадукты ў нас на ўзроўні — смак дзяцінства. Канешне, цяпер асартымент іншы, але прыярытэтам застаецца якасць.

Дарэчы, якасць не замінае колькасці. Ізноў прыйшла добрая навіна — Беларусь увайшла ў сусветны топ-5 лідараў па вытворчасці малака на душу насельніцтва. У нас вырабляецца 853 кг малака на чалавека ў год пры спажыванні крыху больш за 230 кг. Вось яны, «малочныя рэкі» экспартнага накірунку. Ёсць чым ганарыцца.

За малочнай галінай эстафету павінна пераняць мясаперапрацоўка. Важкае слова за машынабудаўніцтвам, ды і ўвогуле за прамысловасцю. Такі ж падыход павінен быць ва ўсім. Ад беларускіх «Атлантаў» да гігантаў-БелАЗаў. Вядома, «Вітаўту» (электробусу) нялёгка пакарыць бязмежныя прасторы Расіі, калі на рынку транспарту што ні месяц, то новая назва тэхнікі з Паднябеснай. Беларуская фішка — стабільнасць. І ў прамысловасці гэта козыр. Мы пайшлі па шляху стварэння мультыбрэндавых цэнтраў, сервісной сеткі. А трэба так, каб як са «Сталічнымі» цукеркамі, — іх у цэнтры Мінска не знойдзеш. Сёння прывезлі — сёння ж раскупілі.

Чым больш якасны прадукт, тым больш маржынальны. Час замест звыклага «наштампуем» і ад «найлепшыя з таннага» рухацца да «якаснае з найлепшага». Гэта пытанне выжывальнасці і прысутнасці ў сусветнай эканоміцы. Зразумела, не ўсё і адразу. Але новы арыенцір зададзены. Як некалі імпартазамяшчэнне. Кіраўнік краіны прабівае шлях да самых перспектыўных рынкаў Сусветнага Поўдня. Гэта самае галоўнае — заслужыць давер. А нам трэба паспяваць за дамоўленасцямі на вышэйшым узроўні.

Калі разважаем пра беларускую якасць, то маем на ўвазе нашу смятану, сыры, каўбасы і цукеркі. Але такім жа «смачным» павінна стаць яшчэ шмат што. У цэлым — якасць жыцця беларусаў, у прыватнасці — кожны трактар, паслуга кожнага стаматолага, ды і ўвогуле асабістая адказнасць кожнага за дасягненне высокай якасці жыцця.

Якасны падыход — гэта яшчэ і павага да сябе, да свайго. Пакупніцкі патрыятызм — тое, над чым трэба працаваць: над больш якасным стаўленнем да беларускага і адзін да аднаго, да сваёй гісторыі, да сваіх тавараў, да ліфта ў гарадской шматпавярхоўцы і аўтобуснага прыпынку ў аграгарадку...

Калі кожны стане больш якасна выконваць сваю працу, тады ў цэлым палепшыцца ўсё навокал. Якасна сабраны камбайн будзе радзей псавацца, а значыць, больш якасна збярэ збожжа, без страт. З кожнага поля эканомія ў мяшок, а ў цэлым па краіне — колькі гэта будзе ў агульнай вазе! Што датычыцца камбайна, то вельмі трапнае параўнанне. Быў час, калі трэба было зрабіць свой. Цяпер мы стварылі аналагі «Джондзіра». Новая мэта — каб ужо «Джондзір» арыентаваўся на «Гомсельмаш». Нараджаецца новы ідэалагічны брэнд — «зроблена беларусамі для беларусаў».

Так мы крочым у элітарны дывізіён краін. Будзе няпроста. Памятаеце, як адразу пасля атрымання незалежнасці Беларусь намагаліся «прапісаць» у трэцяй геапалітычнай лізе. Мы паказалі свой нацыянальны характар і разам дайшлі да моцных сераднячкоў, мінулі крызіс постсавецкага сіндрому. Найлепшае захавалі, нямала стварылі і свайго. Канешне, у элітарны дывізіён краін свету прайсці будзе таксама складана. І адзін з метадаў — якасць. Але тут ёсць адна акалічнасць. Якасць трэба будзе паляпшаць, пачынаючы з сябе. Ну што, гатовы? Тады — наперад!

**Яўген ПУСТАВОЙ.**


## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А.М. Кищенко»** (УНП 600126458), 222520, г. Борисов, ул. Блюхера, 19, тел. 8 033 688 86 54, в лице ликвидатора ООО «Правовая компания «Делегат».

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены **29 декабря 2023 г.** с **11.00 до 16.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС |
|---|---|---|
| 1 | Гараж, инв. № 1-005, общ. пл. 114 кв. м; механические мастерские и склады, инв. № 01-008, общ. пл. 337 кв. м; производственный корпус керамического цеха, инв. № 01-010, общ. пл. 4027,0 кв. м; производственный корпус № 01-003, столовая комбината, инв. № 01-03а, общ. пл. 3000,1 кв. м; проходная, инв. № 01-006 (задняя); проходная центральная, инв. № 01-013, общ. пл. 13 кв. м; склад, инв. № 01-009; склад материальных ценностей, инв. № 01-017, общ. пл. 184 кв. м; склад материальных ценностей, инв. № 01-012, общ. пл. 103,7 кв. м; художественные мастерские, инв. № 01-002, общ. пл. 996 кв. м, г. Борисов, ул. Блюхера, 19 | 977 671,07 |
| 2 | Кабина распылительная, инв. № 328-2 | 100,00 |
| 3 | Кабина распылительная, инв. № 328 | 100,00 |
| 4 | Швейная машина, тип 333Д (GLOBAL), инв. № 456 | 130,00 |
| 5 | Станок точильно-модельный, инв. № 369 | 120,00 |
| 6 | Станок точильно-модельный, инв. № 368 | 120,00 |
| 7 | Шкаф сушильный № 5, инв. № 288 | 60,00 |
| 8 | Изолированное помещение с инвентарным № 610/D-71653 (квартира), общ. пл. 19,4 кв. м, по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Блюхера, д. 19, кв. 4 | 10 367,35 |

Телефон для ознакомления и осмотра: +37529-698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 15.12.2023 г. с 09.00 по 28.12.2023 г. до 16.00:
1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY;
2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB 30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену за лот. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 календарных дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок оплаты предмета торгов: п. 1 – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов, а также возможна рассрочка на условиях договора купли-продажи, п. 2-7 – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 02.11.2023 г., 03.11.2023 г.

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Заславльбурвод»** (Продавец)

Аукцион состоится **28.12.2023 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1 в составе:**
1. **Административно-производственный корпус,** инв. № 630/С-46558, 700 кв. м.
2. **Склад,** инв. № 630/С-46559, 269 кв. м.
3. **Проходная,** инв. № 630/С-46560, 54,9 кв. м.
4. **Здание мастерской,** инв. № 630/С-81238, 106,9 кв. м.

**Адрес лота: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Змитрока Бядули, 15/1; 15/2; 15; 15/3.**

Обременение: аренда.
**Начальная цена с НДС 20 % – 287 827,39 руб.**
**Задаток – 28 782,74 руб. Шаг аукциона – 3 %.**
Земельный участок 642000000001001543, 1,0031 га.
Право постоянного пользования.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на «Электронной торговой площадке GOSTORG.BY» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатка – **26.12.2023 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Сямейная газета
Выпуск № 21 (224)

# АНЁЛЫ ПОБАЧ



*НЕДЗЕ паўгода таму я зусім нечакана для сябе знайшла кавалачак дрэва, на якім быў намаляваны ўсмешлівы анёл з белымі крыламі. Яго прымацавалі да кары разгалістага дуба ў парку. Гэта было так незвычайна, што на душы стала вельмі светла. Я спачатку вырашыла забраць той цуд з сабой, але потым вярнулася і паклала яго на месца. Падумала: няхай радуе іншых людзей. Магчыма, для кагосьці яшчэ гэты анёлак стане добрым знакам, выратаваннем, надзеяй на лепшае.*

*Ужо потым ад прыяцелькі я зусім выпадкова даведалася, што гэты цуд — справа рук мастачкі, якая вырабляе прыгожыя і душэўныя прадметы інтэр'ера з дрэва. Яна вельмі любіць вандраваць па Беларусі і заўсёды бярэ з сабой некалькі мініяцюрных анёлаў, якія пакідае ў розных месцах. Ставіць паміж камянямі на фасадзе старажытнага будынка, кладзе ў дупло старога дрэва ці на падаконні закінутага вясковага дома, на лаўцы, на пні, на парэнчах моста... Ужо каля двухсот такіх маленькіх анёлкаў, якія змяшчаюцца ў далоньку, разляцеліся па Беларусі. Мастачка стварае іх ад вялікага парыву, ад жадання падзяліцца цеплынёй і надзеяй, як быццам кажа мінаку, які знайшоў той маляўнічы кавалачак дрэва: усё будзе добра, твой анёл побач.*

*Пакуль пісала, згадала гісторыю адной сваёй гераіні, якая таксама любіць вандраваць. Пасля тых вандровак у яе нараджаюцца душэўныя нататкі — пра хаткі з неверагодна прыгожымі ліштвамі, пра стары вясковы млын, дзе і сёння меляць збожжа на муку, ды неверагодна прыгожы касцёл, дзе можна паслухаць сапраўдны арган... Аднойчы па дарозе ў чарговую вёску Анэлі стала спякотна. Яна зняла вятроўку і прымацавала яе на багажнік свайго ровара. Праехала шмат кіламетраў, пакуль заўважыла, што курткі няма. Ужо, здаецца, страціла надзею яе знайсці. Але калі вярталася назад, яе куртка, як ветразь, гайдалася на суку дрэва, што расло на ўзбочыне. І ў кішэнях было поўна цукерак. У той момант, прызналася жанчына, яна адчула незвычайную цеплыню да тых незнаёмых людзей, якія, магчыма, спяшаліся, але не праехалі міма.*

*Дарэчы, і сама Анэля — вельмі чулы чалавек, ніколі не пройдзе міма чужой бяды. Напрыклад, год таму яна стала анёлам для адной вялікай і дружнай сям'і. У Насці, Мікіты, Карыны і Дзяніса пасля сур'ёзнай хваробы памерла мама — аднакласніца Анэлі. Жанчыны апошнім часам страцілі сувязь, але ў дзяцінстве былі найлепшымі сяброўкамі. Дык вось дзяцей цяпер выхоўвае іх дзядуля, якому 65 гадоў. Ён — малайчына, спраўляецца: дзеці дагледжаныя, накормленыя, апранутыя. Але ім, асабліва малодшай, якой пяць гадкоў, не хапае жаночай пяшчоты. І гэтую ролю на сябе ўзяла Анэля. У вольны ад працы час яна заязджае да іх у госці, гуляе, малюе, абдымае. Кажа, што яны на сувязі практычна кожны дзень, дзеці ўжо пачалі ёй нават свае сакрэты давяраць.*

*Днямі мне таксама пашчасціла пабыць у ролі добрага анёла. Пачалося ўсё з таго, што напярэдадні ў нашым сямейным адвент-календары аказалася заданне зрабіць нешта добрае для іншага чалавека: «Падумайце, хто патрабуе вашай дапамогі, каму вы можаце паслужыць, праявіце ўвагу». У той дзень я нічога годнага так і не прыдумала... Наступнай раніцай ехала з вёскі ў Мінск на маршрутцы і задрамала. Мяне разбудзіў дотык чыйсьці рукі. «Дачушка, прабач, што патрывожыла. А ты раптам не на Малінаўцы выходзіш?» — «Так». — «Вой, дык добра, а то баюся праехаць свой прыпынак. Я першы раз еду ў Мінск... На пахаванне сына». Перш чым выйсці з маршруткі, я прасачыла, каб бабуля выйшла таксама. На вуліцы наскрозь пранізваў сцюдзёны вецер. Бабуля ў роспачы глядзела на баках. «Вас хтосьці сустрэне?» — «Так, унучка званіла, сказала, што пад'едзе на машыне. Дзе мне лепш яе пачакаць?» — «Хадзем, — кажу, — падвяду вас да прыпынку, там будзе зацішней». І ўзяла яе, як дзіця, за руку.*

*Потым, едучы ў метро на працу, падумала, што мы такія занятыя, пастаянна кудысьці спяшаемся і часам проста можам не заўважыць, што камусьці патрэбны дотык, цёплае слова, кропля ўвагі. І зусім неабавязкова штосьці штучна выдумляць, бегаць у пошуках добрых спраў. Дастаткова проста быць уважлівым штодня, і вы ўбачыце, што вакол шмат нагод для дабрыні, і яны не вымагаюць ад вас празмерных высілкаў, затое для кагосьці станучь сапраўдным добрым знакам, праменьчыкам надзеі. І яшчэ, гэта праверана: калі робіш дабро — сам становішся дабрэйшым і святлейшым. І па жыцці ісці неяк лягчэй.*

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

Тыя, хто побач

# «НЕ ПАТРЭБНЫ ГРОШЫ І КЛАД, КАЛІ Ў СЯМ'І — ЗГОДА І ЛАД!»

## З такім дэвізам ідзе па жыцці шматдзетная сям'я Станкевічаў з вёскі Логавішча Дзяржынскага раёна, да якой мы завіталі ў госці



**СУЖЭНЦЫ Аляксандр і Інга прыдумалі і рэалізоўваюць праект «Вёска малаДАя», сваім прыкладам паказваючы, што жыццё ў сельскай мясцовасці можа быць камфортным і цікавым.**

**Калісьці Аляксандру, які паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, бацькі прапанавалі іх невялікія зберажэнні купіць машыну альбо пачаць будаваць уласны дом. Малады чалавек выбраў другое, цвёрда вырашыўшы застацца на малой радзіме. Хоць разумеў, што туды прыйдзецца ўкласці яшчэ нямала ўласных сродкаў і сіл. З часам у дабудаваны сваімі рукамі дом ён прывёў маладую жонку. А потым сям'я павялічылася і цяпер з цяжкасцю змяшчаецца ў легкавое аўто, якое ў дырэктара Дома культуры пасёлка Энергетыкаў таксама з часам з'явілася.**

### КОЛЬКІ ПАКОЯЎ, СТОЛЬКІ ДЗЯЦЕЙ

Над дзвярыма пры ўваходзе ў дом вісіць іконка і надпіс: «Калі з дабром прыйшоў, заходзь, а калі са злом, прэч ідзі».

— Гэтую таблічку мне на наваселле падарыў сябар, — кажа гаспадар, які выйшаў, каб нас сустрэць. — І, ведаеце, надпіс сапраўды працуе: да нас у хату трапляюць выключна добразычлівыя людзі. Праходзьце, калі ласка!

Пакуль Інга робіць гарачыя бутэрброды на сняданак, Аляксандр пад звонкі акампанемент шасцігадовай Алісы і двухгадовага Арсенія праводзіць экскурсію па доме.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Будзьце пільныя!

# «ЁН ДА МЯНЕ ДАКРАНАЎСЯ»

## Псіхолаг аб тым, як засцерагчы дзяцей ад дамаганняў дарослых

**СЁННЯ нярэдка даводзіцца чытаць, як дзіця стала ахвярай сексуальнага гвалту з боку дарослага мужчыны — на вуліцы ці ў інтэрнэце. Даверлівых малых падманам могуць завесці ў зацішнае месца проста з дзіцячай пляцоўкі ў двары ці папрасіць выслаць свае фатаздымкі ў сацыяльных сетках, а потым імі і шантажыраваць. Чаму павінны навучыць дзяцей бацькі, каб такіх сітуацый не адбылося? У якім узросце варта гэта рабіць? Калі маладыя людзі гатовы да «дарослых» адносін і чаму падлеткавы ўзрост — не лепшы для гэтага час? Чаму дзіцяці адна му лепш не ездзіць у перапоўненым транспарце? Як яго навучыць адстойваць перад незнаёмцамі асабістыя граніцы? Пра гэта размаўляем з псіхолагам Цэнтра «Давер», сяброўскага да падлеткаў, Святланай ПАЛЯШЧУК.**

***— Святлана Міхайлаўна, у якім узросце з дзіцем трэба размаўляць пра тое, як паводзіць сябе з незнаёмымі дарослымі?***

— Усе мы ў жыцці перш за ўсё карыстаемся вопытам, і мадэль паводзін у любой сітуацыі бяром са скарбонкі вопыту. Пачынаць варта не з размовы «што можна, а што нельга», а з таго, што ў дзіцяці трэба фарміраваць паняцце нормы. І закладка паняццяў нормы, якая звязана з палавой недатыкальнасцю, ідзе з самага ранняга ўзросту.

Важным перыядам з'яўляецца ўзрост да 6 гадоў. Гэта перыяд закладкі палавой самасвядомасці, ці палавой ідэнтычнасці. У гэтым узросце для бацькоў вельмі важна прагаварыць з дзіцем правіла інтымных частак цела. Малое прыкладна да трох-чатырох гадоў ужо ідэнтыфікуе сябе з прыналежнасцю да пэўнага полу — «я хлопчык» ці «я дзяўчынка». І ўжо ў гэты перыяд мы можам размаўляць пра асноўныя правілы інтымных частак цела.

Галоўнае правіла — інтымныя часткі цела (тыя, якія хаваем пад адзеннем) мы можам паказваць толькі доктару ці бацькам падчас купання, а староннім людзям нельга іх дэманстраваць. Напрыклад, калі мы ў басейне, то надзяваем купальнік ці плаўкі. Прыкладам служаць, канешне ж, бацькі.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*

Актуальна

# Ад душы ці для Instagram?

**У переднавагоднія дні мы традыцыйна выбіраем падарункі блізкім. Святы — гэта нагода актывізавацца і рознага роду ініцыятывам, якія маюць на мэце дабрачыннасць. Ці ахвотна мы адгукаемся на іх і ці патрэбныя пасрэднікі для дабрачыннасці? А галоўнае — наколькі шчыра мы дапамагаем тым, хто мае патрэбу ў падтрымцы?**



...Гэта дама пачала ўжо крыху раздражняць. Яна атрымала свой заказ у пункце выдачы інтэрнэт-крамы, а потым адгукнулася на прапанову прадаўца паўдзельнічаць у дабрачыннай акцыі: маўляў, купіце што-небудзь з гэтай паліцы, а мы накіруем грошы на дапамогу дзецям, якія хварэюць. Жанчына ўсё ніяк не магла вырашыць, што ж ёй купіць: нататнік ці шакаладку.

Я ж паўдзельнічаць у прапанаванай прадаўцом акцыі адмовілася...

Так атрымалася, што з памяшкання мы з гэтай жанчынай выйшлі адначасова. І яна спытала: «А чаму вы не ўдзельнічаеце ў дабрачыннасці? Вам грошай на шакаладку шкада?»

Трэба было б, вядома, сказаць ёй, што задаваць такія пытанні незнаёмым людзям непрыстойна, але... Адказала, што ўдзельнічаю, але толькі тады, калі сама гэтага хачу, і без пасрэднікаў. Па-першае, крама набывае шакалад і нататнікі ў пастаўшчыка, значыць, абавязана з ім разлічыцца. Па-другое, плюс дзве надбаўкі: гандлёвая і на дабрачыннасць, таму шакалад быў прыкметна даражэйшы, чым звычайна. У выніку непасрэдна на дабрачыннасць пойдзе працэнтаў дзесяць ад усёй сумы.

Многія суб'екты, якія маюць патрэбу ў дабрачыннай дапамозе, размяшчаюць на сваіх сайтах спецыяльны рахунак для такіх мэт. Яшчэ прасцей — зайсці ў раздзел «Дабрачыннасць» у АРІП і выбраць: няхай гэта будзе дапамога людзям ці жывёлам. У такім выпадку чалавек сапраўды ведае, куды накіруюцца грошы... Аднак мая суразмоўніца выказала меркаванне, што я ўсё ўскладняю: навошта, маўляў, нешта шукаць, калі можна скарыстацца ўсім гатовым. На гэтым мы рассталіся.

Увечары актуальную тэму абмеркавала са сваёй нефармальнай «фокус-групай» — сябрамі і знаёмымі. Усе былі аднадушныя: трэба дапамагаць тым, хто аказаўся ў складанай сітуацыі. Маладзейшыя, праўда, лічаць, што сапраўды не варта затлумляцца, калі можна проста паўдзельнічаць у акцыі, як прапануе інтэрнэт-крама. Старэйшыя ж падтрымалі мой падыход: дапамагаць без пасрэднікаў. І дадалі: неабавязкова чакаць свят, дапамога патрэбна заўсёды. І яшчэ ўсе былі аднадушныя ў тым, што дабрачыннасць — не медаль, каб потым усім яго паказваць. Дапамог — і супакойся, не чакай, што цябе пахваляць.

У той вечар мне здалося, што тэма вычарпана. Але не, дні праз два на аўтобусным прыпынку ўбачыла маладую жанчыну з брэндаваным пакетам усё ад той жа інтэрнэт-крамы.

Жанчына расказвала камусьці па тэлефоне, што купіла ўсім падарункі і зараз вось да авансу засталося ўсяго трыццаць рублёў. Акрамя запланаванага, ёй давялося пасля прапановы прадаўца набыць тое-сёе ў дапамогу дзецям, і яна не магла адмовіцца.

— Вось прыеду зараз дадому, раскладу прыгожа падарункі, сфоткаю і выкладу ў Instagram. Напішу, што шакаладку купіла, каб дапамагчы дзеткам!

Ну, вядома ж, як без сацсетак: дзе, як ні там, сябе паказаць?..

А Новы год, між тым, набліжаецца. І навагодні настрой сапраўды матывуе парадаваць тых, каму сёння цяжка. Дык давайце гэта рабіць каму як зручна: з пасрэднікамі ці без іх. Але пры гэтым думаць пра тых, каму дапамагаеш, а не пра тое, які ты добры. І даваць роўна столькі, колькі не цяжка, каб потым не шкадаваць аб сваім высакародным парыве.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

Правілы жыцця

# ДЗЕТКІ І СЕТКІ

## Як пазбавіцца ад «лічбавага сіроцтва»?

**МАЛОЕ заходзіцца ад плачу ў калясцы. Мама дае яму ў рукі смартфон — і наступае доўгачаканая цішыня... Лічыцца, што цяперашнія дзеці з нараджэння валодаюць навыкамі абыходжання з гаджэтамі. Але ці так гэта?**



### Лічбавая адукаванасць з пялёнак — міф

«У кантэксце лічбавай адукаванасці абмяркоўваецца канцэпцыя, дзе маладое пакаленне падзяляецца на тры катэгорыі: лічбавыя сіроты, лічбавыя выгнаннікі і лічбавыя спадчыннікі», — расказаў **Уладзімір ЛЕБЕДЗЕЎ, начальнік аддзела адукацыйнай дзейнасці Сакратарыята Назіральнага савета Парка высокіх тэхналогій,** выступаючы на форуме па кіраванні інтэрнэтам.

Лічбавыя сіроты — гэта менавіта тыя дзеці, якім увагу бацькоў замянілі гаджэты. Яны гадзінамі і суткамі могуць зусім бескантрольна знаходзіцца ў сеціве. Бацькі задаволеныя — нашчадкі іх не турбуюць. А тое, што гэтыя дзеці ўжо жывуць у віртуальным свеце, што яны развучыліся размаўляць, а могуць толькі перапісвацца ў месенджарах, што ў іх замест жывых эмоцый засталіся смайлікі, бацькоў мала хвалюе, маўляў, «такое пакаленне вырасла».



Ёсць і іншая крайнасць — калі бацькі строга рэгламентуюць выкарыстанне гаджэтаў або наогул забараняюць іх ледзь ці не да паўналецця. Таксама нічога добрага. Такі падлетак накідваецца на камп'ютар, планшэт і наганяе ўпушчанае. Ён жа бачыў, што яго аднакласнікі гулялі, глядзелі фільмы, у рэшце рэшт, спісвалі сачыненні з інтэрнэту. Такім падлеткам лёгка трапіць як у гульнявую залежнасць, так і ва ўсякія прыгоды, як правіла, не вельмі прыемныя. У рэдкіх выпадках, лічбавыя выгнаннікі (а гэта менавіта яны) і зусім адмаўляюцца ад сучасных тэхналогій, заяўляючы, што яны зло.

Самая адэкватная катэгорыя — лічбавыя спадчыннікі. Гэта дзеці, якія ўваходзілі ў лічбавы свет пад чулым кіраўніцтвам бацькоў і педагогаў. Яны ведаюць, што такое добра і што такое дрэнна ў віртуальным свеце. Яны не рабы высокіх тэхналогій, а разумныя спажыўцы магчымасцяў, якія тыя даюць.

Лічбавай сіратой можна быць у любым узросце — і ў 10, і ў 30 гадоў. Як правіла, у сеціве яны знаходзяць толькі забаўляльны кантэнт. Пошук нейкай карыснай інфармацыі, напрыклад, раскладу цягнікоў, выклікае цяжкасці. У такіх людзей адсутнічае крытычнае мысленне. «Гэта было ў TikTok» — для іх аксіёма.

Зразумела, што прыроджаных кампетэнцый абыходжання з гаджэтамі няма і быць не можа. А вось лічбавае сіроцтва лёгка перадаецца ў спадчыну. Каб гэтага не адбылося, існуюць розныя адукацыйныя праграмы. У тым жа ПВТ дзейнічае праграма аб'яднання па інтарэсах «Інфарматыка без разеткі». Тут дзяцей 5-7 гадоў у гульнявой форме навучаюць лічбавай адукаванасці. «Праз дашкольнікаў у нашу каманду ўліваюцца дарослыя: бацькі і педагогі», — падкрэслівае Уладзімір Лебедзеў. Такім чынам дарослыя таксама набываюць неабходныя веды, а лічбавыя сіроты пераходзяць у групу лічбавых нашчадкаў.

### Інтэрнэт не адмяняе зносін з бацькамі

Часам можна пачуць: маўляў, у наш час дзяцей выхоўвалі бацькі, а не інтэрнэт. Аднак жа і тады былі бацькі, якія з задавальненнем бавілі час з дзецьмі, роўна як былі і тыя, якія злоўжывалі фразай: «Адчапіся, мне няма калі» або задорвалі дзяцей цацкамі.

Інтэрнэт, як і цацкі, — не выхавальнікі, а ўсяго толькі сродак. Нічым не адрозніваецца бацька, які падарыў сыну цацачную чыгунку (гэтая гульня — мара многіх савецкіх дзяцей) і пакінуў дзіця сам-насам з цацкай, і той, які ўручыў дзіцяці смартфон і планшэт, не навучыўшы яго правілам бяспечных паводзін у сеціве. Адным словам, для дзяцей важней за ўсё зносіны з бацькамі ў любы час.

Калі інтэрнэтам карыстацца для атрымання інфармацыі, калі разумець, што шукаць яе трэба на профільных сайтах, а не на старонках дамарослых коўчаў, то можна знайсці прафесійныя рэкамендацыі для бацькоў з улікам узросту іх дзяцей.

Зразумела, што трохгадоваму дзіцяці маці ці тата знаходзяць мультфільм. Але перш чым прапанаваць яго малому, трэба паглядзець, ці няма там усякага роду страшылак, да якіх не гатовая дзіцячая псіхіка. Маленькае дзіця нельга пакідаць сам-насам з гаджэтам — яно можа выпадкова перайсці па шкоднай спасылцы.

Для дзяцей 5-7 гадоў ужо больш правіл: трэба абмежаваць час карыстання камп'ютарам, не толькі заблакіраваць шэраг чатаў, але і скласці спіс сайтаў, якія адпавядаюць узросту дзіцяці.

Малодшым школьнікам варта нагадаць, што правілы паводзін у інтэрнэце практычна не адрозніваюцца ад правіл у рэальным жыцці: не выдаваць асабістыя даныя, геалакацыю, мець з сябрамі добразычлівыя зносіны. Растлумачыць небяспеку пераходу па розных спасылках, спампоўвання фота ці відэа, калі для гэтага патрабуюць нумар тэлефона для адпраўлення СМС. У гэтым узросце трэба расказаць дзіцяці пра небяспекі, якія ёсць у інтэрнэце, і дамовіцца, што яно будзе дзяліцца з бацькамі ўсім, што яму незразумела ці выклікае дыскамфорт.

**ЦІКАВЫЯ ЛІЧБЫ**

➢ У верасні 1990 года з'явілася савецкая даменная зона su. У нашай краіне доступ у інтэрнэт «Белтэлекам» пачаў даваць у 1997 годзе. У маі 2024 года беларускі дамен by адзначыць сваё 30-годдзе, а дамену БЕЛ споўніцца 10 гадоў.

➢ У Беларусі 8 270 000 карыстальнікаў інтэрнэту.

➢ Зарэгістраваны ў розных сацыяльных сетках 5 500 000 беларусаў.

➢ Статыстыка ад Youtube: мульцікі на гэтай платформе глядзяць дзеці з 3 гадоў, да 11 гадоў 83 % юных карыстальнікаў ужо маюць свой асабісты профіль.

У падлеткавым узросце правілаў яшчэ больш. Перш за ўсё нашчадку неабходна растлумачыць, што інтэрнэт — гэта крыніца інфармацыі, памочнік у вучобе. Надышоў час распавесці, што ўсё, выкладзенае ў інтэрнэце, застаецца там назаўжды. Дамовіцца, што перш, чым выкласці фота ў сеціва, дзіця параіцца з бацькамі. Трэба растлумачыць, як мець зносіны з незнаёмымі людзьмі і што часам у сеціве людзі выдаюць сябе за іншых. Асобна варта пагаварыць аб недапушчальнасці цкавання аднакласнікаў, абражання людзей.

І гэта далёка не поўны набор правіл бяспекі дзяцей у сеціве.

Бацькам варта праглядаць гісторыю браўзера, каб бачыць, якія сайты наведвала дзіця. І лепш папярэдзіць нашчадка пра гэта, каб не складалася адчуванне, што вы шпіёніце. Памятаць пра опцыю «бацькоўскі кантроль» у настройках гаджэтаў.

Асобная тэма — бяспека пакупак у сеціве, выкарыстанне рэквізітаў банкаўскай карткі. Пра гэта таксама трэба расказаць дзецям, перш чым уручыць карту.

Адным словам, чым старэйшае дзіця, тым больш яно патрабуе ўвагі. І тут сучасныя тэхналогіі — добрая нагода, каб бацькі наладзілі даверлівыя зносіны з дзецьмі.

### Для чаго гэта трэба?

Чаму сёння важна валодаць лічбавай адукаванасцю? Таму што, па вызначэнні Уладзіміра Лебедзева, мы жывём у «робатаўладальніцкім» грамадстве. Сёння назіраецца лічбавая няроўнасць, працэй кажучы, у тых, хто валодае тэхналагічнымі навыкамі, больш магчымасцяў для паспяховай кар'еры. Пры гэтым размова не ідзе выключна аб праграмістах — сёння цяжка знайсці галіну, дзе не патрэбна была б лічбавая адукаванасць.

**Ксенія КАВАЛЕЎСКАЯ.**

# «НЕ ПАТРЭБНЫ ГРОШЫ І КЛАД...»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Наваселле я справіў дванаццаць гадоў таму. Год пажыў у адзіноце, а пасля пазнаёміўся з Інгай і... хуценька перацягнуў яе з горада ў вёску (*смяецца*). Неўзабаве пасля знаёмства вырашылі, што будзем заводзіць дзяцей. Я адмыслова будаваў вялікі дом, бо заўсёды марыў пра дружную сям'ю. На наваселлі сябры пажадалі столькі дзетак, колькі ў хаце вольных пакояў. У выніку так і атрымалася: у кожнага з трох нашых дзяцей з нараджэння ёсць асобны пакой.

У пакоі старэйшага, 10-гадовага Ромы, нядаўна зрабілі сучасны рамонт. Аднавілі ўсю мэблю, замовілі фотшпалеры з выявай матацыкла на ўсю сцяну. У планах — паступова зрабіць рамонт і ў пакоях астатніх дзяцей.

***— Аляксандр, няўжо, калі бацькі паставілі перад выбарам: альбо набываем табе машыну, альбо пачынаем будаваць хату, — не было спакусы выбраць першае?***

— Іншы, напэўна, так і зрабіў бы. 18 гадоў, узрост, калі хочацца папантавацца перад дзяўчатамі. Я, вядома, разумеў, што калі выберу хату, машыны мне не відаць яшчэ доўга, бо ўсе грошы прыйдзецца ўкладваць у будаўніцтва. Але аб сваім выбары ніколькі не шкадую.

Будаўніцтва расцягнулася на чатыры гады. Практычна ўсё рабілі сваімі сіламі: і сцены, і дах, і ўнутраныя работы. Штовечар Аляксандр, хоць і была магчымасць застацца начаваць у цёткі, вяртаўся з вучобы з Мінска ў Логавішча. І да ночы шчыраваў на будоўлі. Праз год пасля наваселля побач з хатай з'явілася лазня.





— На 23 лютага першы раз пратапіў, — згадвае Аляксандр. — Памятаю, у адзіноце сядзеў і парыўся. Я вельмі люблю папарыцца, матуля нават жартавала: «Табе спачатку трэба лазню будаваць, а потым хату». І цяпер ходзім у лазню ўсёй сям'ёй штотыдзень. Гэта ўжо стала сямейнай традыцыяй. Акрамя таго, мы вельмі любім вандраваць. У мінулым годзе ездзілі з сябрамі і дзецьмі з палаткамі і лодкай на Вілейскае вадасховішча. Сёлета адпачывалі пад Баранавічамі. Найбольш запомнілася чатырохдзённая паездка, падчас якой наведалі Мірскі, Нясвіжскі і Лідскі замкі, Брэсцкую крэпасць, шклозавод «Нёман»...

Цяпер Аляксандр марыць пра мінівэн, бо тая машына, якую купілі праз два тыдні пасля нараджэння старэйшага сына, для такой вялікай сям'і ўжо цеснаватая.

## У ЗАГС З ЗАВЯЗАНЫМІ ВАЧЫМА...

За сняданкам Інга з Аляксандрам расказалі гісторыю свайго знаёмства. Пра тое, як хлопец, які працаваў культарганізатарам у вясковым Доме культуры, прыехаў у Дзяржынскі райвыканкам забраць светлавы лазер для клуба. І з першага погляду закахаўся ў бухгалтара аддзела культуры. Дзяўчына адказала ўзаемнасцю.

— Да той сустрэчы я неадназова чула пра яго. Сашава мама працуе дырэктарам Дома культуры ў Логавішчы, дык калі заходзіла да нас у аддзел, казала: «У мяне такі сын добры, сам вокны ў хаце мые». «Во, — падумала тады сама сабе, — які малайчына!»

— Сасваталі, сказалі: «Тут дзеўка добрая, а ў яго хата ёсць», — падміргвае Аляксандр.

На сценах у доме шмат сямейных фотаздымкаў, у тым ліку і з вяселля. Яно, аказваецца, было незвычайным. Прапанову ажаніцца Аляксандр зрабіў вельмі творча. У той дзень Інга збіралася адзначаць у кафэ сваё 30-годдзе. Але малады чалавек употайкі купіў пярсцёнкі, загадзя дамовіўся з работнікам загса пра дату роспісу, а імяніннвіцу прывёз туды з завязанымі вачыма.

— Па-іншаму сюрпрыз не атрымаўся б. Пра яго ведалі, акрамя мяне, толькі два чалавекі — мае мама і сястра, — кажа Аляксандр.

— Менавіта з імі я і паехала выбіраць сукенку на юбілей. Калі шчыра, планавала купіць сабе маленькую чорную. Але яны ўгаварылі спыніць свой выбар на доўгай, крэмавага колеру. Перад кафэ Саша сказаў, што ў яго для мяне сюрпрыз, і павёз у Станькава на фотасесію.

— Па парку ходзяць людзі і кажуць нам: «Віншуем маладых!». Інга мне: «Станкевіч, ты ўяўляеш, яны думаюць, што ў нас з табой вяселле!». Я толькі ўсміхнуўся ў адказ. А потым завязаў ёй вочы і павёз у загс. Маўляў, цябе чакае яшчэ адзін сюрпрыз. Памятаю, як развязваю Інзе вочы, і ў гэты момант гучыць марш Мендэльсона... Яна плача, я плачу, рэгістратар плача...

Адным словам, сюрпрыз атрымаўся на славу. Прычым не толькі для Інгі, але і для ўсіх гасцей.

## ПЕРШЫЯ КРОКІ ЗРАБІЎ НА СЦЭНЕ

***— На сценах, акрамя вясельных, ёсць таксама фотаздымкі з удзелу ў конкурсе «Сям'я года». Як атрымалася, што вы пачалі выступаць сям'ёй на сцэне?***

— Першы раз нам прапанавалі паўдзельнічаць у конкурсе «Уладар сяла», калі Алісе было два месяцы. Саша напісаў сцэнарый, я нагатавала шмат страў. У якасці групы падтрымкі з намі паехалі свёкар ды кум, яны мужчыны статныя, кожны вагой больш за сто кілаграмаў. Адзін з іх надзеў маску каня, другі — маску парсюка.

— Так супала, што ў кума майка была ў чорна-белую палоску. Журы падыходзіць, а я экспромтам вырашыў пажартаваць. Маўляў, падзівіцеся, якога ладнага кабанчыка гадуем, з праслоечкай, скрыжаваны в'етнамскі і наш беларускі від... У той дзень мы яшчэ пілавалі і seklі дровы, запрагалі каня, выступалі на сцэне. У выніку атрымалі прыз сімпатый гледачоў, і нам за гэта далі трох трусоў. ...Пару гадоў таму нам прапанавалі паўдзельнічаць у конкурсе «Сям'я года». І мы адразу ж пагадзіліся. Інга прынялася шыць касцюмы (яны і цяпер у ліку іншых сцэнічных вобразаў вісяць у шафе. — **Аўт.**). А я зноў узяўся за сцэнарый. Ён у мяне атрымаўся, як заўсёды, з гумарам.

Гумар, перакананы Аляксандр, дапамагае не толькі на сцэне, але і ў сямейным жыцці. Калі якое непаразуменне ці спрэчка, не трэба назапашваць негатыў у сабе, хадзіць і злавацца. Дастаткова проста пажартаваць, пасмяяцца разам — і напружанне знікае.

— У нас Арсеній яшчэ хадзіць не ўмеў, яму было 10 месяцаў. І я прыдумаў, што падчас прэзентацыі сям'і ён пасядзіць у дзіцячым крэсле, а мы вакол яго штосьці паробім. Па маім сцэнарыі, ён павінен быў у фінале выступлення прайсці ад таты да мамы. І што вы думаеце, мае прагнозы пацвердзіліся — першыя крокі ён зрабіў менавіта на сцэне. Гледачы вельмі цёпла нас прынялі, таму мы атрымалі неймавернае задавальненне ад выступлення. У выніку перамаглі і паехалі прадстаўляць Мінскую вобласць на рэспубліканскім конкурсе «Сям'я года».

***— Вы прадстаўлялі на конкурсе сацыяльна значны праект «Вёска маладая». Што азначае асабіста для вас жыццё ў вёсцы?***

— Жыццё ў вёсцы — гэта свежае паветра, лес пад бокам, свой участак побач з домам, магчымасць вырошчваць натуральную гародніну і трымаць гаспадарку... Праўда, з гаспадаркі ў нас цяпер засталіся толькі куранкі, якія штодзень радуюць нас свежымі яйкамі. А раней гадавалі і трусоў, і в'етнамскіх свіней.

— Калі жыў з бацькамі, у нас былі і качкі, і індыкі, і куры, і карова, і свінні, і нават конь. Як толькі Інга пагадзілася са мной сустракацца, я яе адправіў даіць карову. Падумаў, калі не спужаецца, не ўцячэ, значыць мой чалавек.

— А калі я першы раз прыехала да яго ў госці, мы пайшлі разам складваць дровы. Рамантыка, праўда? — смяецца Інга.

***— Зноў жа, правяраў напэўна...***

— А як жа ж, нашто гультайку браць? — таксама ўсміхаецца Саша. — Дзяцей змалку стараемся прывучаць да працы. У Ромы гэтым летам з'явілася асобная градка, якую ён даглядае. Памятаю, у маім дзяцінстве, калі мы з сястрой прасіліся на возера купацца, бацькі казалі: «Калі градкі прапалолі, можаце ісці». У нас выхаваўчы працэс пабудаваны такім жа чынам — праз заахвочванне. Акрамя таго, мы беражліва захоўваем традыцыі святкавання беларускіх народных абрадаў. І стараемся перадаць іх дзецям. Абавязкова святкуем асноўныя каляндарныя святы — Купалле, Каляды. Ходзім па вёсцы ад хаты да хаты на Шчодрык. Ромка і Аліса якраз нядаўна пыталіся, ці пойдзем сёлета калядаваць.

— Мы нізашто не прамянялі б свой дом на гарадскую кватэру. Таму стварылі ў Instagram суполку «Вёска малаДАя» і папулярызуем жыццё ў вёсцы.

— Тут, у нас, нічым не горш, чым у горадзе. Камунікацыі ўсе ёсць: газ, святло, вада. У 2019 годзе правялі інтэрнэт. Старшыня сельсавета сказаў, што і асфальт у вёсцы хутка з'явіцца. Дзяцей у школу возіць школьны аўтобус. Раней у Стоўбцы ў басейн ездзілі, ужо пабудавалі сучасны фізкультурна-аздараўленчы комплекс бліжэй, ва Уздзе. Вельмі зручна, што ў будынку Дома культуры ў пасёлку Энергетыкаў, дзе я працую, ёсць гурткі, куды дзеці ходзяць пасля школы. Рома займаецца каратэ, Аліса — танцамі. У мяне заканчваецца праца, я іх забіраю, і едзем разам на машыне дадому. І ў нашым Логавішчанскім клубе дзеці наведваюць гурткі.

— Летам ім у вёсцы наогул раздолле. Цэлымі днямі гуляюць на вуліцы. Захочуць — агародамі пайшлі да бабулі. А ў горадзе дзяцей адных з кватэры не выпусціш нават у двор.

— Мая матуля жыве вунь там, бачыце, віднеецца жоўценькая хатка. Калі бацькі побач, гэта вельмі зручна ўсім. Мы ім па гаспадарцы дапаможам, а яны, калі трэба, за дзецьмі прыгледзяць. Дарэчы, давайце пакажам вам свой участак, — прапанаваў Аляксандр. — Якраз збіраўся лазню прапаліць.



Дзеці цёпла апрануліся і з радасцю выбеглі на двор, досталі цюбінгі, снежкалепы.

— Сёння снегу нягуста, — кажа Інга. — А вось калі шмат нападае, Саша на сваім трактары зграбае яго адмысловай насадкай у цэнтр участка, які стаіць на схіле, і робіць сапраўдную горку.

— Ды такую класную, што не трэба ні ў Раўбічы, ні ў Сілічы ехаць, — смяецца Аляксандр.

Звярнула ўвагу, што сцены лазні ды альтанкі, дзе ў сезон сям'я часта збіраецца за сталом, прыгожа размаляваныя. Гэта, як высветлілася, справа рук Інгі. Маючы траіх дзяцей, яна ўмудраецца знаходзіць час на ўласныя захапленні. Майструе з ізалону кветкі-начнікі, у тым ліку і вялікія, у рост чалавека, і дорыць іх сваякам і сябрам. Акрамя таго, майструе заколкі для Алісы, пячэ смачныя торцікі — нядаўна рабіла шматпавярховы сваякам на вяселле.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК,**
*Дзяржынскі раён.*
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
**(Больш фотаздымкаў на сайце «Звязды.)**

***— Падчас бацькоўскага тыдня вы ў ліку іншых сем'яў ездзілі на «Размову аб важным: шчаслівая сям'я — моцная дзяржава» ў Полацк, дзе сустракаліся з Наталляй Качанавай. Ва ўсіх удзельнікаў дыялогу была магчымасць агучыць тое, што хвалюе. Ці былі нейкія прапановы ў вашай сям'і?***

— Наша прапанова звязаная з мацярынскім капіталам на будаўніцтва жылля. Сёння атрымаць яго могуць толькі шматдзетныя сем'і, якія стаяць на чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Але ж ёсць і такія, як наша, якія яшчэ да нараджэння дзяцей пабудавалі сабе дом. Разам з тым мы думаем пра будучыню дзяцей. І гатовы назбіраць грошай, дадаваць да мацярынскага капіталу і пабудаваць кватэру, замацаваўшы яе за сынам. Каб, калі яму споўніцца 18 гадоў, у яго ўжо было сваё жыллё.

— Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава прасіла ўсіх паказваць на сваім прыкладзе, што вялікая сям'я — гэта цудоўна, каб маладыя пары не баяліся нараджаць двух і больш дзяцей, — дадае Інга. — Што датычыцца нас, то гэта схема ўжо працуе. Пасля ўдзелу ў конкурсах нашу сям'ю часта запрашаюць выступіць на розных мерапрыемствах у школе, у бібліятэцы. Мы з радасцю ходзім, праводзім майстар-класы, ніколі не адмаўляемся!

# «ЁН ДА МЯНЕ ДАКРАНАЎСЯ»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

У дзіцячым садку гэта павінны закладваць выхавацелі. Вядома, дзецям у гэтым узросце цікава разглядаць свае інтымныя часткі цела, напрыклад, калі ўсіх высаджваюць на гаршчок. Але выхавацелька павінна патлумачыць, што, напрыклад, свае інтымныя часткі цела мы рукамі не чапаем.

**Такім чынам мы фарміруем у дзіцяці ўсведамленне, што правільна, а што не. У гэтым узросце, дзесьці да 12 гадоў, дзеці вельмі ўспрымальныя да ўсяго, што кажуць і чаму вучаць бацькі. А ўжо пасля 12 пачынаецца перыяд разгортвання самастойных сэнсаў, калі дзіця вучыцца атрымліваць уласны вопыт. Але яно будзе абапірацца на тую базісную закладку, якая сфарміравана раней.**

З 6 да 10 гадоў, да перыяду палавога саспявання, наступае час латэнтнай, або схаванай сексуальнасці, калі сексуальная энергія перанакіроўваецца ў іншае рэчышча. У хлопчыкаў гэта энергія носіць разбуральны характар, а ў дзяўчынак — стваральны. Таму хлопчыкам мы прапануем сублімаваць яе ў актыўныя гульні накшталт «вайнушкі», у спорт — у такія віды дзейнасці, якія фарміруюць мужнасць. Для дзяўчынак гэта заняткі, якія носяць стваральны характар — танцы, творчасць.

Калі дзіця не занята ў гэты перыяд, схаваная энергія можа служыць нагодай для непакою і трывожнасці, напрыклад, дзіця можа мастурбіраваць. Часам самі бацькі могуць стымуляваць сексуальную энергію праз візуальную цікавасць, напрыклад, прагляд бацькамі фільмаў 16+ ці 18+.

Часам, калі няма адпаведнай культуры, бацькі могуць выходзіць аголенымі з душа ці браць дзіця з сабой у лазню. Гэта можа паслужыць ранняму прабуджэнню сексуальнасці, калі дзіця кагнітыўна яшчэ не гатова.

І часта менавіта такія дзеці становяцца аб'ектам ці мішэнню людзей, якія маюць адпаведныя намеры. Можа і нармальнае дзіця стаць ахвярай, але гвалтаўнік не так часта дзейнічае праз ломку, ён падыходзіць акуратна, угаворамі, «зандзіруе» патрэбу дзіцяці.

Калі гэта патрэба ў непаўналетняга падагрэта візуальнымі вобразамі, ёсць цікавасць да гэтай тэмы, то дзіця можа наведваць адпаведныя сайты і ісці на падобныя размовы. І гэта выклікае ў яго пачуцці страху і цікавасці. І яно не раскажа пра гэта бацькам, бо падсвядома разумее: у гэтым ёсць штосьці няправільнае ці нядобрае. Таму яшчэ раз заклікаю звярнуць увагу менавіта на закладку нормы.

У перыяд палавога саспявання, прыблізна ў 10-12 гадоў, прабуджаецца сексуальная цяга, і тады падлеткі самі праяўляюць цікавасць да візуальных вобразаў. А сёння інтэрнэт прадстаўляе ўсе магчымасці для гэтага. Таму, улічваючы, што ўзрост 10-12+ — гэта час цікавасці да візуальных вобразаў, бацькі павінны праяўляць асаблівую пільнасць.

**Я заўсёды раю дарослым звяртаць увагу на тое, хто ў сябрах у вашага дзіцяці ў сацыяльных сетках. Калі вы бачыце 16-18-гадовага сябра ў 12-гадовага дзіцяці, звярніце на яго ўвагу. Пажадана, каб з гэтай нагоды бацькі да 14-15 гадоў захоўвалі кантроль. На кансультацыях я сутыкаюся з тым, што ў 12-гадовых дзяцей ёсць пароль на тэлефоне, і бацькі распісваюцца ва ўласнай бездапаможнасці. Гэта сведчыць пра страту бацькоўскіх функцый, бо ўсё ж у такім узросце адказнасць за паводзіны дзяцей ускладаецца на бацькоў.**

***— Калі на вуліцы да дзіцяці падыходзіць незнаёмы чалавек і пачынае размову з нейтральнай просьбы ці прапановы, як яно павінна паводзіць сябе? Што павінны растлумачыць бацькі?***

— Мы кажам пра тое, што бацькі — абсалютны аўтарытэт для дзіцяці дзесьці да 7 гадоў, узросту



> **«Бацькі павінны растлумачыць, што адносіны паміж 12-13-гадовым дзіцем і 21-гадовым дарослым — гэта не норма. Дзіця будзе ахвярай у гэтых адносінах».**

сацыялізацыі. А калі яно ідзе ў школу, мы ўключаем іншых дарослых ва ўзаемадзеянне з ім. І да гэтага часу павінны быць агавораны асноўныя правілы ўзаемаадносін з незнаёмымі і староннімі людзьмі.

Пра што павінны пагаварыць бацькі? Тут правілы такія. Калі на вуліцы да цябе падышоў незнаёмец і пытаецца, колькі часу, можаш яму адказаць. Можаш растлумачыць, як прайсці на нейкую вуліцу. Але калі ён просіць некуды правесці, дзіця павінна дакладна ўсведамляць: мы нікога нікуды не праводзім, не заходзім з ім у пад'езд ці ліфт і не ідзём разам у магазін. Кажам, што мне так рабіць не дазваляюць бацькі.

Калі дзіцяці здаецца, што за ім ідзе нехта падазроны, яно не павінна заходзіць у пад'езд ці ліфт, а толькі ў людныя месца, напрыклад у магазін. Або павінна вярнуцца ў школу ці спыніцца і зрабіць званок бацькам.

Многія бацькі маюць функцыю адсочвання месцазнаходжання дзіцяці па мабільным тэлефоне. Мы гэта рэкамендуем, і ў нашай практыцы было некалькі выпадкаў, калі дзякуючы геалакацыі бацькі папярэдзілі магчымыя супрацьпраўныя дзеянні ў дачыненні да дзіцяці.

***— Як правільна растлумачыць дзецям і падлеткам правілы камунікацыі ў інтэрнэце?***

— Уласна кажучы, гэта адбываецца, калі мы вучым дзіця правілам інтымных частак цела, пра якія я казала. Сёння ў інтэрнэце часта можна сустрэць просьбы сфатаграфаваць сябе, у тым ліку ў аголеным выглядзе, і дасላць. Калі ва ўзросце да 5 гадоў бацькі асноўныя правілы не заклалі і дзесьці граніцы размытыя (напрыклад, дзіця спіць у ложку з маці пасля 5 ці нават 10 гадоў), то, як правіла, гэтыя дзеці і становяцца аб'ектамі нездаровай цікавасці з боку дарослых маніпулятараў. У летніх лагерах часта такое здараецца, калі няма побач бацькоў.

**Ва «ўзросце спатканняў» — 13-14 гадоў — вельмі важны эмацыянальны кантакт і даверлівыя адносіны бацькоў з дзіцем. Важна навучыць падлетка правілам заляцанняў. У хлопчыкаў і дзяўчынак розныя ролі і розныя паводзіны. І адносінам у пары вучаць бацькі «свайго» полу: бацька расказвае хлопчыку, маці — дзяўчынцы. Гэта правіла ўласных граніц, і абавязкова дзеці павінны быць яму навучаны.**

Сёння, калі падлеткі ўтвараюць пары і гэта іх першы вопыт, яны некампетэнтныя, бо бацькі з імі не размаўляюць. Добра, што ў нас расказваюць пра прэзерватывы, кантрацэптывы, бяспеку, пра тое, як папярэдзіць цяжарнасць. Але элементарныя правілы асабістых граніц, правілы заляцанняў дзеці не ведаюць. Яны не разумеюць, што рабіць на першым спатканні, хлопчыкі не ведаюць, як праяўляць увагу, дзяўчынкі не ўмеюць яе прымаць.

Такія дзеці прыходзяць з траўмамі пасля разрыву. Нядаўна на кансультацыі 13-гадовая дзяўчынка расказала: прапанавала аднакласніку сустракацца, напісала і запрасіла яго некуды. А ён яе заблакіраваў. Вось такі першы траўмавальны вопыт. Дзяўчынка павінна ведаць, што яе роля — выклікаць цікавасць хлопчыка, звярнуць на сябе яго ўвагу, а дзеянні — гэта крок, які належыць хлопцу. Бо яны часам палохаюцца актыўнасці з боку дзяўчыны. Такі траўмавальны вопыт потым адаб'ецца на самаацэнцы дзяўчыны і на выбудоўванні далейшых адносін.

***— Нярэдка крыніцай гвалту становяцца равеснікі або не нашмат старэйшыя школьнікі, бо дзяўчынка не можа адмовіць хлопцу, які падабаецца...***

— Важна сказаць, што ва ўзросце палавога саспявання, у 11-13 гадоў, дзяўчаты вельмі падатлівыя сексуальна актыўнаму, напорыстаму партнёру. Варта пра гэта памятаць. Часцей за ўсё ахвярамі сексуальнага гвалту становяцца дзяўчаты гэтай узроставай групы. Такім партнёрам можа быць як 15-16-гадовы падлетак, так і дарослы хлопец, які ўмее маніпуляваць.

Падлеткі не гатовы да паўнацэнных адносін у пары. Калі мы кажам пра ўзрост згоды — 16 гадоў, — мы абапіраемся на фізіялогію. А калі ўлічваць псіхалагічны кампанент, калі сфарміраваны лобныя долі, якія адказваюць за кантроль, калі чалавек цалкам можа кіраваць сваімі паводзінамі, гэта 18—21 год. Узрост палавога саспявання знізіўся, а кагнітыўная, наадварот, вырас.

Таму важна фарміраваць платанічную фазу — фазу адухоўленасці пачуццяў, фарміравання ідэалу. Раней гэта рабілася на ўроках літаратуры: у нас былі літаратурныя героі, на прыкладах якіх мы маглі бачыць прыгажосць адносін. Сёння недастаткова фарміруецца платанічная фаза, ідэальны вобраз адносін, таму ёсць мноства праблем у далейшых адносінах.

**Гэта найперш частая змена палавых партнёраў. Ва ўзросце 13 гадоў падлеткі сфакусіраваны на адчуваннях. Ім падабаюцца новыя, раней незнаёмыя адчуванні, звязаныя з сексуальнай цягай. Гэта ўзрост эксперыментаў, але яны не гатовы браць адказнасць за партнёра. Яны любяць найперш уласныя адчуванні, пачуццё закаханасці, таму тут вельмі шмат розных наступстваў.**

Таксама бацькі павінны растлумачыць, што адносіны паміж 12-13-гадовым дзіцем і 21-гадовым дарослым — гэта не норма. Дзіця будзе ахвярай у гэтых адносінах. Таму бацька павінен сустрэцца з маладым чалавекам і паразмаўляць, высветліць, што яму патрэбна ад дзіцяці.

Што датычыцца вопыту першых спатканняў, калі знаёмства адбылося ў інтэрнэце, то першы раз маці павінна знаходзіцца дзесьці на адлегласці ад дзяўчынкі, але недалёка, каб пераканацца, што прыйшоў на спатканне падлетак, а не дарослы чалавек. Канешне, не варта падбягаць, вітацца, але дзяўчынка павінна разумець, што мама побач.

***— Калі дзіця стала ахвярай шантажу ў інтэрнэце, як псіхалагічна дапамагчы яму ў такой сітуацыі?***

— Тут можна парэкамендаваць толькі зварот да спецыяліста, бо такую сітуацыю абавязкова трэба прапрацаваць. І тут важны момант, наколькі карэктнымі былі адносіны з боку праваахоўных органаў. Гэта часта траўмуе нават больш, чым сама падзея. Дзіця часам вымушана некалькі разоў глядзець запіс, яго водзяць у тое месца, дзе ўсё адбылося, гэта становіцца вядома класу, школе. Мы сутыкаемся з рэтраўматызацыяй, і прапрацаваць гэта ўжо нашмат складаней.

> **«Многія бацькі маюць функцыю адсочвання месцазнаходжання дзіцяці па мабільным тэлефоне. Мы гэта рэкамендуем, і ў нашай практыцы было некалькі выпадкаў, калі дзякуючы геалакацыі бацькі папярэдзілі магчымыя супрацьпраўныя дзеянні ў дачыненні да дзіцяці».**

***— Часам бываюць сітуацыі, калі дзіця становіцца ахвярай гвалту ў перапоўненым транспарце, калі дарослы чалавек дазваляе сабе распускаць рукі. Як папярэдзіць такія сітуацыі і чаму трэба навучыць дзіця?***

— Сарамлівасць дзіцяці — часам праблема, з-за якой яно не хоча абазначаць парушэнне яго граніц. Але мы павінны навучыць гэтаму. Напрыклад, мы абазначаем, што гэта мая рэч, мой пакой, маё адзенне і робім гэта вербальна — словам. Калі нехта возьме нашу рэч, мы кажам: «Не бяры, гэта мой тэлефон, мая куртка». Гэтак жа мы кажам: «Не чапайце мяне, мне непрыемна», і робім гэта гучна. Так мы акрэслілі сваю граніцу. Калі і далей яе парушаюць, дзіця павінна сказаць: «Я раскажу бацькам (дарослым, настаўніку)», бо часам гэта бывае і на тэрыторыі школы, калі іншыя дзеці недзе ў кут заціснулі.

Калі гэта сітуацыя адбываецца ў аўтобусе пры старонніх людзях, дастаткова абазначыць яе вербальна, гучна, і чалавек хутчэй за ўсё адразу адыдзе. Ён і дзейнічае толькі таму, што граніцы не абазначаныя. Таму наперад з дзіцем трэба абгаварыць такія сітуацыі, якія могуць здарыцца, асабліва калі транспарт перапоўнены. Гэта можна нават дома прарэпеціраваць, каб дзіця гэта агучыла.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ДЫК НЕ ДАСТАВАЙСЯ Ж ТЫ НІКОМУ!

## Да чаго даводзіць рэўнасць



Атэла і Дэздэмона: самы знакаміты твор пра рэўнасць належыць, вядома ж, пяру Шэкспіра.

**ПРА рэўнасць спрадвеку стваралі вершы і рамансы. Гэта пачуццё — сюжэтная аснова цэлага шэрагу вядомых літаратурных твораў. Некаторыя з іх уваходзяць у школьную і ўніверсітэцкую праграмы. Часта мастацтва ставіць знак роўнасці паміж рэўнасцю і сапраўдным каханнем. Але свет літаратуры, музыкі, жывапісу і кіно ілюзорны, а ў рэальнасці жыць з раўніўцам — нялёгкі лёс...**

Няма такой дзяўчыны, якая не марыла б сказаць сваё цвёрдае «Так!» каханаму і адзінаму. Дзеля кахання прыгожы пол гатовы на ахвяры. Да гэтага жанчын стагоддзямі рыхтуюць з дзяцінства: «Сцерпіцца — злюбіцца», «Святы абавязак жанчыны — берагчы сямейны агмень», «Лепш пакутаваць ды кахаць, чым без кахання на свеце жыць» і гэтак далей, у тым ліку «Раўнуе — значыць, кахае».

Сямейныя псіхолагі адзначаюць: аб тым, што выбраннік — раўнівец, жанчыны, якія ў рэшце рэшт прыходзяць да спецыяліста з гэтай праблемай, часта ведалі яшчэ да замужжа. І, зыходзячы са здаровага сэнсу, паталагічная рэўнасць — якраз нагода адказаць на прапанову рукі і сэрца ад такога чалавека цвёрдым «не». Але, па-першае, «ружовыя акуляры» і «матылі ў жываце» не маюць са здаровым сэнсам нічога агульнага, па-другое... раўнуе — значыць, кахае!

— Насамрэч, рэўнасць — гэта не пра каханне. Гэта пра ўладу і прыгнечанне партнёра ў адносінах, — распавядае **сямейны псіхолаг Ірына МЕЛЬНІКАВА**. — Раўнівец лічыць, што іншы чалавек «належыць» яму, але ж існуе небяспека, што ён можа раптам пачаць «належаць» камусьці іншаму. Прычыны такой дэфармаванай карціны свету варта шукаць у далёкім мінулым раўніўца, а дакладней, у яго дзяцінстве.

### ЦІ МАЛІЛАСЯ ТЫ НА НОЧ, ДЭЗДЭМОНА?

Класічны псіхааналіз тлумачыць паталагічную рэўнасць нязжытым дзіцячым вопытам. Фрэйд сцвярджаў, што ва ўзросце 2-4 гадоў практычна ўсе дзеці раўнуюць аднаго з бацькоў процілеглага полу да другога з бацькоў. Зрэшты, некаторыя паслядоўнікі Фрэйда лічылі інакш: маўляў, літаральна з нараджэння і хлопчыкі, і дзяўчынкі раўнуюць маці да бацькі, паколькі менавіта ўзаемадзеянне з маці і яе прыхільнасць у першыя гады жыцця з'яўляюцца ключавымі для выжывання дзіцяці. Але калі цяпла і клопату ў сям'і малому хапае, то да 4-5 гадоў гэтую «дзіцячую хваробу» перарастаюць нават самыя ўпартыя маленькія раўніўцы. Ну, а калі любові малому ў бацькоўскай сям'і катастрафічна не хапала, не перарастаюць і цягнуць з сабой рэўнасць ужо ва ўласную сям'ю...

— Паталагічны раўнівец падсвядома шукае «свайго», прыдатнага для прайгравання яго дзіцячай траўмы, партнёра, знайшоўшы — шукае патэнцыяльных «рабаўнікоў», якія жадаюць адабраць яго «ўласнасць»: тых, да каго яе (або яго) можна раўнаваць. А ў крайніх праявах нават «трэція лішнія» для гэтай гульні не патрэбныя. Яны могуць быць толькі нейкімі «ценамі» на гарызонце. У гульні ўдзельнічаюць двое: раўнівец і яго ахвяра.

***— Але навошта ўдзельнічаць у гэтай гульні іншаму партнёру? Бо ролю ахвяры пастаяннай рэўнасці наўрад ці можна назваць выйгрышнай...***

— Тыран і ахвяра — адзін з распаўсюджаных відаў сузалежнасці.



Такія адносіны выгадныя абодвум удзельнікам, хоць у выпадку з ахвярай выгада невідавочная. Дапусцім, тыран-раўнівец падаўляе жонку, дыктуе свае ўмовы, абмяжоўвае яе свабоду і гэтак далей — часам аж да фізічнага гвалту. Іншымі словамі, «выпускае на волю» свае дзіцячыя траўмы. Але і ахвяра мае сваю цікавасць. Вонкава пакорлівая, яна тонка маніпулюе «тыранам», атрымліваючы мноства маральных і матэрыяльных бонусаў. Тут і раскаянне партнёра (якое часта суправаджаецца падарункамі), і, напрыклад, пачуццё ўласнай значнасці, бо навакольныя яе шкадуюць і лічаць пакутніцай. Але, паўтаруся, я кажу пра крайнія праявы. Такую мадэль узаемаадносін псіхолагу вельмі складана перабудаваць: партнёры, звярнуўшыся да спецыяліста і быццам бы выказваючы жаданне будаваць больш здаровыя адносіны, на самай справе ўсім задаволеныя і з усіх сіл супраціўляюцца зменам. Але ўсё ж часцей рэўнасць — сапраўды праблема для партнёра, і нярэдка абодва хочуць выбудаваць нармальныя, адэкватныя адносіны. І ў гэтым выпадку псіхолаг сапраўды можа дапамагчы. Таму, сутыкнуўшыся з такой праблемай, лепш вырашаць яе разам са спецыялістам. Не варта падманваць сябе, спадзеючыся, што партнёр зменіцца сам. Дзіцячыя псіхалагічныя траўмы — гэта падсвядомасць, і разумныя доказы, якія вы можаце прывесці, тут не дапамогуць. У раўніўца ў наяўнасці — праблемы з самаацэнкай, гіпертрафіраванае пачуццё ўласнасці. Некіравальная рэўнасць падобна да хваробы — чалавек не кантралюе свае дзеянні і здольны нанесці не толькі маральную шкоду, але часам і фізічныя траўмы.

Ды і маральная шкода — зусім не бяскрыўдная рэч. «Палкі і камяні могуць пакалечыць, а словы па лбе не б'юць»? Як бы не так! Многім мужчынам-раўніўцам (жанчынам, зрэшты, таксама) уласціва абясцэньваць «другую палавінку», прыніжаючы яе знешнія даныя (занадта худая або занадта тоўстая, ногі недастаткова доўгія, валасы недастаткова густыя і г. д.), разумовыя здольнасці і прафесійную кампетэнтнасць («Што ты там робіш, на сваёй працы?», «З чаго гэта ты стамілася?»). Такім недарэчным спосабам раўнівец выказвае свой падсвядомы страх страціць спадарожніцу, і каб гэтага не здарылася, выбірае, з аднаго боку, тактыку запалохвання, з другога — разбурэнне яе самаацэнкі.

### НЯМА КАХАННЯ БЕЗ РЭЎНАСЦІ?..

Калі ў многіх жанчын да гэтага часу знаходзіць водгук у душы народная мудрасць «раўнуе — значыць, кахае», то мужчыны ва ўсе часы пабойваліся раўнівых жанчын, пазбягаючы адносін з тымі, хто кантралюе кожны іх крок. Зрэшты, і яны часам (хоць і радзей, чым жанчыны) сутыкаюцца з паталагічнай рэўнасцю сваёй «палавінкі». «Дзе ты быў? Чаму затрымаўся? З кім размаўляў па тэлефоне? Чаму паставіў ёй лайк? У вас нешта было?»

— Жаночая рэўнасць, як і мужчынская, «родам з дзяцінства», — падкрэслівае спецыяліст. — Напрыклад, у бацькоўскай сям'і дзяўчынка назірала здрады бацькі і пакуты маці з гэтай прычыны. І яе падсвядомасць памятае горыч і крыўду мамы. Стаўшы дарослай, такая жанчына, як бы ні паводзіў сябе яе выбраннік, будзе прыкмячаць у падабенства з паводзінамі бацькі. Яе не будзе пакідаць думка: «Ён хутка мне здрадзіць. Я павінна гэта прадухіліць». Давер — свайго роду рэсурс, якога ў раўніўца проста няма.

Ёсць і іншыя прычыны, якія спараджаюць раўнівіц: напрыклад, страх адзіноты (асабліва пры наяўнасці агульных дзяцей). Ёсць дзяўчаты, выхаваныя так, што ўсё жыццё маюць патрэбу ў «моцным плячы» і «каменнай сцяне». Яны асуджаныя на тое, што страх адзіноты будзе ўзмацняцца па меры старэння і адначасова будзе мацнець рэўнасць. У аснове жаночай рэўнасці можа ляжаць і нізкая самаацэнка, пачуццё няўпэўненасці ў сваёй каштоўнасці — для партнёра і для свету ў цэлым. І, нарэшце, багатая фантазія і эмацыянальнасць. Здавалася б, станоўчыя якасці, але яны могуць скажаць успрыманне рэальнасці такой вось уражлівай натурай. То-бок іх рэўнасць мае суцэльна разумныя падставы, але толькі ў іх галаве, у прыдуманым імі свеце...

### ХТО ВІНАВАТЫ І ШТО РАБІЦЬ

— Пачнём з таго, што ў адносінах з раўніўцам рабіць катэгарычна нельга. Першае і галоўнае — закрываць вочы на праблему, бясконца даруючы раўніваму партнёру, — падкрэслівае суразмоўніца.

**Таксама ў «чорным спісе» — наступныя катэгарычныя «не»:**

➢ Не адступацца ад сваіх правілаў і інтарэсаў пад ціскам раўніўца. Дазволіўшы яму татальны кантроль над вашым жыццём, вы з часам страціце сябе, ператварыўшыся ва ўласны цень.

➢ Не апраўдваць неадэкватныя паводзіны мужа (жонкі) цяжкім дзяцінствам або перажытымі ў дарослым узросце псіхалагічнымі траўмамі.

➢ Не закрываць вочы на той факт, што праявы рэўнасці ўзмацняюцца (калі гэта так). Спецыялісты адзначаюць, што многія ахвяры дамашняга гвалту адчувалі ўзмацненне ўздзеяння на іх, але ўвесь час вырашалі, што ім «падалося».

➢ Не правакаваць раўніўца. Часам жанчыны лічаць такую правакацыю спосабам спакушэння або сродкам дадаць «іскру» ў адносіны. Гэта небяспечная гульня. З іскры можа разгарэцца полымя, якое здольна моцна абпаліць. І сапраўды гэтак жа нельга прымаць і падхопліваць, як таленавіты музыка знаёмую мелодыю, гульню раўнівага партнёра: кідацца суцяшаць яго, калі ён ізноў прымецца пакутаваць ад беспадстаўнай рэўнасці.

➢ Не маўчаць. Замоўчваючы праблему, вы нібыта дазваляеце далейшы гвалт над сабой. Выказвайцеся аб паталагічнай сітуацыі ў вашай сям'і і аб неабходнасці яе вырашаць. Аб вашай крыўдзе, страху, негатыўных эмоцыях, недапушчальнасці падобных паводзін. Але, зразумела, выбіраць для такой гутаркі трэба зручны час: калі раўнівец знаходзіцца ва ўраўнаважаным стане.

➢ Не старацца апраўдвацца, даказваючы ўласную невінаватасць, вернасць і каханне. Вашы апраўданні — частка класічнага сцэнарыя раўніўца, а ваша задача — разарваць гэта заганнае кола.

Ну, а зараз — што ўсё ж рабіць?

— Відавочна, што сітуацыю могуць разрадзіць цярпенне і ўвага (калі гаворка не ідзе аб вашых асабістых межах, аб аб'юзе з боку партнёра). У ідэале дапамогуць даверлівыя зносіны і ваша праца над павышэннем самаацэнкі партнёра, — кажа сямейны псіхолаг. — Магчыма, градус рэўнасці мужа ці жонкі знізіць больш блізкае знаёмства з вашымі сябрамі і калегамі. І, зразумела, сумесны вольны час, выхадныя, водпуск — гэта выключыць падазрэнні. Але ўсе гэтыя дзеянні з вашага боку дапамогуць выправіць сітуацыю не заўсёды. Таму мая асноўная парада: калі рэўнасць партнёра — сапраўды праблема, звяртайцеся да псіхолага. Спецыяліст дапаможа абодвум разабрацца ў глыбінных прычынах іх паводзін. Вы навучыцеся ўвасабляць у жыцці сваё каханне не праз боль і рэўнасць, а праз гармонію і дабрабыт.

**Дзіяна РОНІНА.**

*14 декабря 2023 года в издательском доме «Звязда» опубликована проектная декларация на строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)*

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ № 18

**НА СТРОИТЕЛЬСТВО ОБЪЕКТА**:

«Строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)». II очередь строительства. Индивидуальные жилые дома, КПП, ограждение территории.

**Информация о застройщике:**

**Застройщик:** производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 08 ноября 2000 года № 1266 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100011299.

**Юридический (почтовый) адрес:** 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 100-817.

***Режим работы для приема заявлений и заключения договоров:*** понедельник – пятница с 9.00 до 18.00.

**Производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» в качестве заказчика построило следующие объекты:**

- бизнес-центр «Покровский», г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, нежилой фонд,
- многоквартирный жилой дом, г. Минск, ул. К. Черного, д. 25, жилой фонд,
- санаторно-курортный комплекс «Плисса», Витебская область, Глубокский район, деревня Плиса, улица Гвардейская, дом 4, нежилой фонд.

Тым не менш у апошні дзень сваёй работы, 29 лістапада, спецкамісія прадставіла справаздачу, у якой рэкамендавала забараніць Дональду Туску займаць дзяржаўныя пасады. Такая ж рэкамендацыя была дадзена ў дачыненні да былых міністраў Яцэка Ціхоцкага, Багдана Кліха, Томаша Семянякі і Барталамея Сянкевіча. Усе яны былі абвінавачаныя ў сувязях з Расіяй ці, горш за тое, з ФСБ, а таму былі названыя «пагрозай нацыянальнай бяспецы». Зрэшты, саветнік Анджэя Дуды Лукаш Жапецкі заўважыў, што спецкамісія «мела права на меркаванне», аднак насіла яно рэкамендацыйны характар. Як адзначаюць заходнія СМІ, скарыстайся прэзідэнт такой падставай, гэта прывяло б да канстытуцыйнага крызісу, не кажучы ўжо аб непрадказальных наступствах і жорсткай рэакцыі партнёраў па ЕС.



### Вогнетушыцель у парламенце

Кур'ёзны выпадак у духу ПіС адбыўся ў польскім парламенце на стадыі зацвярджэння ўрада Туска. Прапанавалася адкласці абмеркаванне пасля інцыдэнту, падчас якога дэпутат ад ультраправай партыі «Канфедэрацыя свабоды і незалежнасці» Гжэгаж Браўн патушыў з вогнетушыцеля выстаўленыя ў будынку ханукальныя свечкі. «Фракцыя партыі «Права і справядлівасць» жадае спынення дыскусій па праграме Дональда Туска да заўтра. Мы не можам працаваць у такой атмасферы», — прыводзіць Польскае радыё словы дэпутата ад гэтай партыі Пшэмыслава Чарнека. Але справа ўсё ж была даведзена да завяршэння.

Упершыню ў гісторыі Польшчы кабінет міністраў сфарміравала большасць, якая складаецца адразу з чатырох партый, прычым зусім не блізкіх ідэалагічна: умоўна ліберальнай «Грамадзянскай платформы», левых з «Левіцы», Польскай сялянскай партыі і кансерватыўнай «Польшчы 2050» (усе апошнія партыі складалі на выбарах блок «Трэці шлях»). Вастраслоўы ўжо ахрысцілі новы кабмін «латкавым урадам», называючы гэтыя сплаў маладосці і досведу, правых і левых, радыкалаў і прыхільнікаў паступовых змен выбухной сумессю, якая рана ці позна прывядзе да распаду кааліцыі і датэрміновых выбараў. Другія лічаць, што як мінімум да намечаных на 2025 год прэзідэнцкіх выбараў кааліцыянты будуць асуджаныя на адзінства, паведаміла «Бі-бі-сі». Сам Дональд Туск, прадстаўляючы свой урад, пераконваў, што нягледзячы на палітычную разнамаснасць, яго каманда стане ўзорам салідарнасці, лаяльнасці і адказнасці.

У склад кабінета міністраў увайшоў, у прыватнасці, Радаслаў Сікорскі (кіраўнік МЗС). Пасаду першага намесніка старшыні ўрада і міністра абароны заняў лідар Польскай народнай партыі Уладзіслаў Касіняк-Камыш. Міністэрства юстыцыі ўзначаліць Адам Баднар, які актыўна змагаўся супраць судовай рэформы папярэдняга ўрада.

### Разбурэнне і растрата

Прэм'ер-міністр Польшчы ў сваім выступленні ў парламенце распавёў аб зменах, якія плануе ўнесці ва ўнутраную і знешнюю палітыку краіны, паведаміла агенцтва EFE. Падчас выступлення ў польскім парламенце Туск заклікаў да «дэмакратычнага абнаўлення ўсіх дзяржаўных інстытутаў». Ён таксама паабяцаў «неадкладна пачаць работу» для «радыкальнага паляпшэння становішча ўсіх жанчын у Польшчы» і падкрэсліў імкненне «вярнуць законнае месца» Польшчы ў Еўропе. Прэм'ер Польшчы аб'явіў аб намеры дабіцца павышэння зарплат настаўнікаў і прафесараў на 30 працэнтаў, увесці закон аб рэгуляванні аднаполых шлюбаў і стварыць камісіі, якія зоймуцца расследаваннем дзейнасці папярэдняга ўрада.

Раней Дональд Туск абвінаваціў былую кіруючую партыю Польшчы «Права і справядлівасць» у разбурэнні дзяржавы і ў растраце грашовых сродкаў. Пра гэта паведамляе агенцтва PAP. «ПіС вырашыла выкарыстоўваць апошнія тыдні для разбурэння, зносу польскай дзяржавы, для размеркавання грошай поўнымі прыгаршчамі сярод сваіх», — цытуе палітыка агенцтва.

Паводле ацэнак прадстаўнікоў экспертнай супольнасці і медыярэсурсаў, прыход да ўлады ў Польшчы новага ўрада будзе спалучаны з татальнымі праверкамі і рэвізіямі ў кампаніях і арганізацыях з доляй дзяржуласнасці. Гэта, верагодна, прывядзе да масавых звальненняў і кадравых «чыстак» кіраўнікоў, прызначаных па пратэкцыі партыі «Права і справядлівасць», паведаміў тэлеканал АНТ. Аналітыкі, спасылаючыся на прадстаўнікоў апазіцыйных сіл, прагназуюць, што ў першую чаргу дбайным праверкам падвергнуцца дзяржаўны энергетычны канцэрн Orlen, «Пошта Польшчы», тэлеканал TVP, а таксама кампанія «Цэнтральны камунікацыйны порт». «Усе члены наглядальных і кіраўнікоў саветаў дзяржаўных кампаній будуць звольненыя. Мы правядзём новы набор на празрыстых умовах, а вырашальным фактарам будзе кампетэнтнасць, а не сямейныя ці партыйныя сувязі», — заявіў адзін з лідараў «Грамадзянскай платформы» новы міністр дзяржмаёмасці Барыс Будка.

Урад Туска сапраўды зусім не асуджаны на поспех, заўважаюць эксперты. Першае месца на нядаўніх парламенцкіх выбарах заняла менавіта «Права і справядлівасць», якую працягваюць падтрымліваць каля трэці палякаў. Прэзідэнтам краіны застаецца прадстаўнік гэтай партыі Анджэй Дуда, які наўрад ці будзе садзейнічаць новаму ўраду ў яго пачынаннях. Таму мясцовыя назіральнікі ўжо цяпер канстатуюць, што галоўным выклікам для Дональда Туска на пасадзе будзе пераадоленне глыбокага расколу ў польскім грамадстве, заканчэнне «польска-польскай вайны».

Зрабіць гэта будзе вельмі няпроста. Па-першае, таму што прыцягненне прадстаўнікоў мінулай улады да адказу было адным з найгалоўных перадвыбарных абяцанняў новай улады, і ўжо цяпер зразумела, што папярэднікі будуць казаць аб палітычных пераследах і апеляваць да сваіх прыхільнікаў. Па-другое, стабілізацыі грамадскіх настрояў не садзейнічае і тое, што з парламенцкімі выбарамі Польшча ўвайшла ў перыяд палітычнай турбулентнасці: увесну наступнага года яе чакаюць мясцовыя выбары, улетку — выбары ў Еўрапарламент, а ў 2025 годзе палякі будуць абіраць новага прэзідэнта. Гэта значыць, што палітычная палярызацыя ў краіне непазбежна будзе ўзрастаць і сутычка паміж дзвюма галоўнымі дзейнымі асобамі польскай палітыкі — Дональдам Тускам і Яраславам Качыньскім — будзе працягвацца.

### Адбыўся раскол

У польскім грамадстве адбыўся сур'ёзны ідэалагічны раскол. Мясцовыя жыхары ў асноўнай масе больш не жадаюць заставацца заложнікамі непрадказальнай палітыкі. Аб гэтым у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» заявіў галоўны рэдактар польскага партала «Страйк» Мачэй Вішнеўскі. Ён перакананы, што хісткае становішча парламента будзе вельмі цяжка выправіць. «Раскол у польскім грамадстве — гэта факт. Я думаю, што прорва паміж тымі, хто галасаваў за Качыньскага, і тымі, хто аддаў свае галасы Туску, настолькі вялікая, што гэты разрыў не ўдасца пераадолець у бліжэйшы час. Я думаю, што для гэтага спатрэбіцца як мінімум некалькі гадоў. Стварыць нармальную цывілізаваную дзяржаву ў такіх умовах будзе вельмі цяжка», — адзначыў Мачэй Вішнеўскі.

Польшча раскалолася на больш ліберальныя заходнюю і цэнтральную часткі і ўсходнюю, якая прытрымліваецца кансерватыўных каштоўнасцяў, заўважыў на YouTube-канале БелТА старшыня таварыства «Веды», генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін. «У гэтым плане ўсходняя частка Польшчы блізкая па ўнутранай палітыцы да той ідэалагічнай лініі, якая праводзіцца ў Беларусі і Расіі. І гэта ўяўляе вялікія праблемы для польскага грамадства. Як і антырэкордныя лічбы па інфляцыі і беспрацоўі з 1993 года, гэта значыць з моманту шокавай тэрапіі», — падкрэсліў Вадзім Гігін.

Польскае грамадства галасавала не за Дональда Туска, а супраць Яраслава Качыньскага і партыі «Права і справядлівасць». «Качыньскі надакучыў польскаму грамадству. Ён абсалютны рэкардсмен па антырэйтынгах у польскім грамадстве. Большасць палякаў яго проста ненавідзіць, таму яны галасавалі супраць яго. І гэта сведчыць пра вельмі глыбокіх, доўгатэрміновых працэсах у польскім грамадстве, — перакананы эксперт. — І дай бог, каб польскае грамадства праз многія гады прыйшло да ўсведамлення свайго сапраўднага месца ў Еўропе і свеце».

**Пётр ДУНЬКО.**

### ❍ Даслоўна

У стане беларускіх збеглых у Польшчы фіксуюцца паўпанічныя настроі, якія звязаны з фарміраваннем новага польскага ўрада. Аб гэтым журналістам заявіў **старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Іван ТЭРТЭЛЬ.** Старшыня КДБ зазначыў: як будуць развівацца адносіны Беларусі і Польшчы пасля фарміравання новага польскага ўрада, сказаць складана. Тым не менш, дадаў ён, у стане беларускіх збеглых фіксуюцца сур'ёзныя паўпанічныя настроі. «Яны былі вельмі сур'ёзна звязаны з палітычнай сілай, якая адышла ў мінулае. Там былі сур'ёзныя фінансавыя злоўжыванні. Цяпер ідзе спроба знайсці людзей, якія маглі б паўплываць на пазіцыю новых польскіх улад. Для збеглых самае страшнае — устанаўленне нармальных адносін паміж нашымі дзяржавамі. Гэта самае балючае для іх», — падкрэсліў Іван Тэртэль.

# ПА ПАКУПКІ ДА СВЯТА

**Мая свякруха ў свае 73 — упэўнены карыстальнік усіх вядомых сацсетак і прызнаны раднёй і ўсімі знаёмымі знаўца 100 і аднаго рэцэпта салатаў. Ёсць у яе падборцы і мноства страў-чэмпіёнаў любога святочнага застолля. На працягу года яна тэсціруе новыя рэцэпты з інтэрнэту, выбірае, якія з іх прыгатаваць на Новы год — каб не надта дорага ды смачна. Загадзя складае меню. Аб'ект для параўнаўчага зрэзу яна добры. Жыве не ў горадзе, а раёне, атрымлівае пенсію ў 740 рублёў. Да навагодняга стала прадукты купляе паступова, адкладаючы частку грошай загадзя. Я папрасіла яе скласці шпаргалку, што абавязкова купяць сярэднестатыстычныя гаспадыні, рэцэптамі з якімі мая свякруха якраз-такі і абменьваецца ў сацсетках. Спіс пакупак вырашыла праверыць на наяўнасць у крамах аграгарадка Бабовічы, што амаль за 20 кіламетраў ад Гомеля. А заадно і склала разам з вяскоўцамі рэйтынг любімых навагодніх пачастункаў.**

## На аліўе і модныя салаты

— Абавязкова бяруць сыравэндаленую каўбасу, вэнджаныя курыныя сцёгны, крылцы ў вакуумнай упакоўцы, каўбаскі «пальцам пханыя». На аліўе пойдзе каўбаса без сала. Да свят замовім больш «кандытаркі» — тартоў, піражных. Шмат гадоў працую прадаўцом, таму ведаю, які тавар карыстаецца попытам да свят, — расказвае аб гандлі **загадчыца фірмовай крамы ААТ «Птушкафабрыка «Рассвет» у аграгарадку Бабовічы Міла ГУТЫРА**.

Міла Генадзьеўна дадае: людзі ўжо закупляюцца, нехта спецыяльна грошы пакідаў з пенсіі ці зарплаты.

— За дзень у будні звычайна пакупнікоў 150–200, у выхадныя амаль 300. Прыязджаюць па пакупкі не толькі мясцовыя, але і з найбліжэйшых вёсак — з Дзятлавічаў, Чкалава, Шарпілаўкі, Узы. Перад святамі тавараабарот павялічыцца як мінімум у тры разы. Мы працуем 31 снежня, так што хто забудзецца пра каўбасу для аліўе, паспее купіць абавязкова, — супакойвае прадавец.

— Аліўе ўжо даўно не робім, больш новых модных салатаў хочацца, — падхоплівае размову пакупніца, жыхарка Бабовічаў, якая прадстаўляецца Валянцінай Іванаўнай. — Мы цяпер гатуем салаты больш з гароднінай. Абавязкова купім фрукты, мяса, каўбас, чырвонай рыбкі на бутэрброды. Сям'я ў нас — сем чалавек: мы з мужам, сын, нявестка і тры ўнучкі. У горад па пакупкі наогул не ездзім. Я пастаянны кліент гэтай крамы, як адкрылі яе крыху больш за год таму, — не можам нарадавацца. Загадзя нічога не купляглі да Новага года, навошта? Увесь час усё свежае. Да свята яшчэ і большы выбар будзе.

Пераконваюся, што ў краме — вялікі выбар курыных набораў. Ёсць паўфабрыкаты: каўбасы, нагетсы, якія людзі разбіраюць. Ёсць некалькі відаў хлеба, батонаў, кандытарскіх вырабаў, кансерваваны гарошак, кукуруза.

## Барацьба за пакупнікоў

Як даведалася, у Бабовічах — цэнтральным аграгарадку сельсавета — ажно шэсць харчовых крам: дзве Гомельскага філіяла абласнога спажывецкага таварыства, тры фірмовыя ад сельгаспрадпрыемстваў, адна прыватная. Гандлёвая інфраструктура асвоіла тэрыторыю аграгарадка ў асноўных зонах пражывання. На тэрыторыі — два мікраёны новай малапавярховай забудовы, дзе ў асноўнай жывуць маладыя сем'і. Дзве цэнтральныя вуліцы, дзе жыве больш пенсіянераў, сыходзяцца ў цэнтры населенага пункта. Тут размешчаны адразу тры крамы. Вырашаю, куды падацца па фрукты...

З хурмой у кульках пакупнікі выходзяць з крамы спажыўкааперацыі.

— У нас шмат крам, але гэта мая самая ўпадабаная. Тут дзяўчынкі-прадаўцы і падкажуць, і дапамогуць выбраць, культура сэрвісу не горшая, чым у горадзе, — размаўляем з мясцовым жыхаром Сяргеем. — Мы ўжо з жонкай рыхтуемся да Новага года. Я люблю ў чыгунках рабрынкі запячы, сам раблю галёнку і шашлык. У мяне альтанка закрытая, там барбекю і мангал, а мяса на шашлык якраз тут і куплю.

Як распавяла **прадавец крамы «Родны кут» Гомельскага філіяла абласнога спажывецкага таварыства Вольга МАКАРАВА**, нягледзячы на тое, што яны працуюць на вёсцы, дзе амаль ва ўсіх свае агароды, у людзей вельмі папулярная агародніна — цыбуля, бурак, бульба. Тое, што трэба на «селядзец пад футрам».

— У тым месяцы прадалі прадукцыі на 83 тысячы рублёў, гэта пры тым, што ў Бабовічах, акрамя нас, пяць крам. Працуем удвaix — з васьмі да васьмі, летам з васьмі да дзесяці. Мы ведаем сваіх пакупнікоў, хто што купляе. Да свят больш пойдзе, вядома, мясная прадукцыя, вэнджаніна, — кажа прадавец.

Звяртаю ўвагу, што ў гэтай краме, акрамя харчовых, ёсць і прамтавары. Калі хтосьці з жыхароў захоча купіць нешта буйнагабарытнае, ад крамы да дома дастаўка бясплатная.

## Можна набыць гатовае

У фірмовай краме «Гомельскай птушкафабрыкі», што побач, якраз рыхтуюцца фасаваць навагоднія салодкія падарункі.

— Гэта працаўнікам нашай гаспадаркі да Новага года, і проста пакупнікі могуць набыць наборы, — кажа **прадавец Таццяна ЗАЯЦ**.

У Бабовічах знаходзіцца вытворчае аддзяленне названага сельгаспрадпрыемства. Таму ў краме ў кошт зарплаты могуць набываць тавар работнікі гаспадаркі. Гэты гандлёвы пункт, пераконваюся, лідар па продажы яек: пойдуць ва ўсе салаты. Бяруць людзі каўбасу, галубцы. Прадавец звяртае ўвагу на кансервы сельгаспрадпрыемства — жалудачкі, сэрца, шыйкі, ялавічына, каша з курыцай... Калі нехта захоча адпачыць ад гатоўкі — самае то.

Каб трапіць у яшчэ адну краму, давялося дабірацца да найбліжэйшага пасёлка Дружба. Тут жывуць работнікі НПС «Гомель» прадпрыемства «Гомельтранснафта Дружба». Жыхарку пасёлка нафтавікоў Ірыну Рыгораўну перахопліваю каля прылаўка фірмовай крамы прадпрыемства «БабовічыАгра» ААТ «Гомельагракамплект».

— У горад нават няма патрэбы ехаць па штосьці, — кажа пакупніца. — Я раіла б купляць тут свініну. Раблю на Новы год мяса па-французску, таму трэба добрыя стэйкі. Мае ўнучкі заказваюць на Новы год абавязкова салат «Цэзар», раблю «Селядзец пад футрам», купляю шампанскае, фрукты. Лічу, што праблем з прадуктамі і з тым, што прыгатаваць, увогуле няма, рэцэпты бяру з інтэрнэту ці з сяброўкамі абменьваемся. Галоўнае — былі б грошы і здароўе. Думаю, на стол для сям'і, як у нас — мы з мужам, дзеці і тры ўнучачкі — рублёў 800 трэба.

## Па прадукты едуць і з Гомеля

Канкурэнцыя паміж гандлёвымі пунктамі ў Бабовічах, сапраўды, высокая, таму, пэўна, і выбар багаты ў крамах. Бабовіцкі сельсавет, дзе восем населеных пунктаў, на першым месцы ў раёне па плошчы. Толькі ў аграгарадку жыве больш за 1600 жыхароў, у цэлым на тэрыторыі сельсавета больш за тры тысячы.

— Шмат у Бабовічах грамадзян сезоннага пражывання, бо на тэрыторыі сельсавета больш за 60 садаводчых таварыстваў. Па прадукты ў мясцовыя крамы прыходзяць, прыязджаюць і гаражане, якія на выхадныя едуць у вёскі да бацькоў. Шмат пакупнікоў і сярод працаўнікоў найбліжэйшых прадпрыемстваў, — дапамагае разабрацца ў сістэме вясковага гандлю часова выконваючы абавязкі **старшыні Бабовіцкага сельвыканкама Леанід ЦАЛКА**. — Не ўсюды на тэрыторыі сельсавета такі выбар крам, узнікаюць праблемы, але яны вырашаюцца. Для сельскіх населеных пунктаў, дзе няшмат жыхароў, адзіны спосаб забяспечыць людзей харчовымі таварамі — аўтакрама. Сёння звяртаем увагу, што, каб забяспечыць пакупніцкі попыт, неабходна павялічыць колькасць рэйсаў аўтакрам на тыдзень. З аддаленых вёсак па прадукты людзі прыязджаюць і ў самі Бабовічы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# «У НОВЫ ГОД — ЗА ДОБРЫМ СТАЛОМ»

### У Скідзелі рыхтуюцца да свят з абодвух бакоў прылаўка

**Усе мы добра ведаем: каб накрыць святочны стол, мала быць добрым кухарам, трэба яшчэ і прадукты адпаведныя набыць. Іх, як правіла, кожны шукае па сваім гусце. Многія імкнуцца прыкупіць інгрэдыенты для далікатэсных і экзатычных страў. Ці здольныя крамы ў невялікіх населеных пунктах задаволіць нашы патрэбы? Каб высветліць гэта, накіруемся ў горад Скідзель.**

Дабрацца з Гродна да горада-спадарожніка нескладана. Можна выбраць маршрутку, дзе кошт білета складае амаль 4 рублі, альбо прыехаць цягніком усяго за 1 рубель 20 капеек. Выбар упаў на цягнік невыпадкова. Менавіта каля чыгуначнага вакзала знаходзіцца адна з крам сеткі Гродзенскага аблспажыўтаварыства. Прычым гандлёвая кропка — адна ў наваколлі.



Раён не назавеш ажыўленым. У асноўным, жылы масіў з аўтобусным прыпынкам непадалёк ад крамы. Ну і сам чыгуначны вакзал побач. Па словах прадаўца Святланы, крама працуе даўно. Пераважна ў пастаўках тавараў няма. Праўда, пакупнікоў сюды заходзіць няшмат, падчас майго наведвання завітала толькі адна жанчына. Па словах прадаўца, жыхары ходзяць па пакупкі ў аб'екты іншых гандлёвых сетак, якія размешчаны значна далей. Асартымент свайго магазіна Святлана называе «з ліку неабходных» — тое, што суправаджае кожнага ў штодзённым жыцці. З садавіны толькі яблыкі. Не ўразіла і разнастайнасць хлеба-булачных вырабаў — у наяўнасці іх пасля абеду толькі па адным відзе. А вось «хадавы» тавар прысутнічае ў шырокім спісе: малочныя, мясныя вырабы, каўбасы, крупы... Сюды можна зайсці, каб забяспечыць сябе ежай у звычайны дзень, але для святочнага стала, прама скажам, далёка не ўсё знойдзецца. Што ж, паспрабуем завітаць у іншую краму той жа гандлёвай сеткі.

Накіроўваемся ў аддаленую частку горада. Трэба сказаць, што Скідзель мае сваю адметнасць — ён размешчаны не кампактна, а раскіданы на вялікай адлегласці па абодвух баках трасы. Значная яго плошча знаходзіцца ў раёне найстарэйшага ў Беларусі цукровага камбіната. Яго будаўніцтва суправаджалася жыллёвай забудовай з поўнай інфраструктурай. Гэта быў свайго роду горад у горадзе. Ад чыгуначнага вакзала — некалькі кіламетраў. Напачатку быў намер выклікаць таксі, але дыспетчар прапанавала чакаць паўгадзіны. Пашанцавала з аўтобусам — і вось здалёк ужо бачны зялёны колер патрэбнай крамы.

Па словах загадчыцы Шчучынскага філіяла «Гроднааблспажыўтаварыства» Марты Кулеш, іх магазін адзіны на ўвесь раён. Таму тут заўсёды рух. Але ці адпавядае асартымент запытам мясцовых жыхароў, асабліва ў перыяд падрыхтоўкі да навагодніх свят.

— Кіраўніцтвам прадпрыемства вядзецца маніторынг асартыменту, таму недахопу ў прадукцыі няма, хоць падчас свят рух узрастае, — зазначае Марта Леанідаўна. — І мы не адстаём, заказы ідуць пастаянна, штодзень адгружаем машыны. Перад святам робім акцэнт на салодкія падарункі, шампанскага бяром значна больш, чым звычайна. Многія цяпер купляюць інгрэдыенты для салатаў: зялёны гарошак, кукурузу, алівы, сыры, маянэз. Тое, што ўваходзіць у склад традыцыйных святочных страў. Усё гэта закупляецца крыху раней, чым, напрыклад, вяндліна ці іншыя мясныя далікатэсы. Гэты тавар мы таксама заказваем больш звычайнага. Завозім розныя віды рыбы, а вось морапрадукты не карыстаюцца попытам, таму іх продаж не практыкуем.

Напярэдадні свят аб'ёмы паставак некаторых відаў прадукцыі павялічваюцца ў некалькі разоў. Аб папулярнасці крамы сведчыць і колькасць наведвальнікаў. Па словах загадчыцы, у дзень бывае да 400-450 чалавек, а ў перадсвяточныя дні яшчэ больш. У гандлёвай сетцы Скідзеля шырока практыкуюцца акцыі. Толькі ў гэтай сетцы ў горадзе працуе дысконтная картка зніжак для пенсіянераў, шматдзетных, інвалідаў. Месцічы шырока карыстаюцца такой магчымасцю. У іх ліку і пенсіянерка Яніна Іванаўна. Кажа, што ходзіць сюды пастаянна.

— Няма чаго скардзіцца — усё, што трэба, ёсць, можна закупіцца. Можа, для маладых чагосьці не хапае, але для нас усё ёсць. Прыгатую на свята катлеты, курыцу, свініну ў духоўцы запяку. Калі спатрэбіцца, паедзем з сынам у фірмовую краму сельгаспрадпрыемства за мяснымі вырабамі. Яна нядаўна адкрылася ў Скідзелі.

Наша падарожжа між тым працягваецца. Наступны адрас — крама на вуліцы Зялёнай. Гэта пераезд у трэцюю частку горада. Крама знаходзіцца каля ажыўленай трасы. Пры ўваходзе наведвальнікаў сустракае снегавік з навагоднімі падарункамі. Прадавец Марына Занеўская з гатоўнасцю прадстаўляе асартымент прадукцыі.

— Канкурэнцыя, вядома, цяпер ёсць, у Скідзелі некалькі гандлёвых сетак. Але да нас многія прыходзяць менавіта па прадукцыю нашага Шчучынскага філіяла — гэта і каўбасы, і напіткі, і рыбны асартымент, скумбрыя мясцовага вэнджання, селядзец наш таксама, маянэз. Да яго, дарэчы, ужо ўся наша сям'я прызвычаілася, іншага не бяром. Ёсць і па 200, і па 400 грамаў. Ёсць свае яблыкі, гародніна. Што заказваем, усе заяўкі выконваюцца, — каменціруе Марына Міхайлаўна.

Да размовы далучаецца Павел, які бывае ў Скідзелі праездам і абавязкова заходзіць сюды. Кажа, што зручна для тых, хто едзе па мінскай трасе, ды і асартымент нядрэнны.

— Трэба закупіцца загадзя, — лічыць пакупнік Павел. — Бо ў новы год важна ўвайсці з добрым сталом. Калі стол бедны — гэта недапушчальна, думаю, у беларусаў такога няма. Ды і ў крамах ёсць усё для багатага стала. Можна, вядома, і ў адным супермаркеце атаварыцца, але цяпер у нас паўсюдна ёсць фірмовыя крамы, дзе вялікі асартымент мясных паўфабрыкатаў, рыбы. Крамы Белспажыўсаюза таксама з багатым асартыментам. Мы сюды ходзім. Гэта ж «Родны кут». Тут яблыкі танныя, гародніна свая, беларуская. Для розных страў ёсць прадукты. Галоўнае — смачна іх прыгатаваць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

*(Працяг тэмы. Пачатак на 1-й стар.)*

# НА ПРЫЛАЎКАХ АЎТАКРАМЫ...

## Мандарыны, шампанскае, цукеркі

**Ці магчыма сустрэць Новы год у аддаленай вёсцы так, каб на стале былі ўсе неабходныя атрыбуты свята? Ці карыстаюцца попытам у вясковых жыхароў ананасы і чырвоная рыба? На гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнт «Звязды» знайшла адказ у Віцебскім аблспажывецтаварыстве, завітаўшы разам з аўталаўкай у Віцебскі раён напярэдадні навагодніх свят.**




Экіпаж аўтакрамы Вольга КУЗЬМІНА і Міхаіл ЛАРЫЁНЕНКА запрашаюць зрабіць пакупкі.

### УВАГА ДЛЯ КОЖНАГА

У склад Віцебскага абласнога спажывецкага таварыства ўваходзяць сем філіялаў і сем унітарных прадпрыемстваў. У сістэме аблспажывтаварыства функцыянуюць 685 гандлёвых аб'ектаў, у тым ліку 580 стацыянарных і 105 перасоўных, з іх 103 — аўтакрамы. У сельскай мясцовасці працуюць 70 працэнтаў ад агульнай колькасці стацыянарных аб'ектаў, 172 крамы размешчаны ў населеных пунктах з колькасцю жыхароў да 200 чалавек.

Аўталаўкі абслугоўваюць 59,9 тысячы чалавек з 3518 населеных пунктаў паўночнага рэгіёна, з іх 208 — з колькасцю жыхароў адзін чалавек, 889 — ад двух да пяці, 819 — ад шасці да дзесяці чалавек. Выходзіць, што крэда аблспажыўтаварыства «Жыць клопатам вяскоўцаў» — не пусты гук, і сацыяльная арыентаванасць пераважае над эканамічнай выгадай.

Па графіку аўтакрамы дастаўляюць прадукты першай неабходнасці і іншыя тавары, якія можна заказаць жыхарам аддаленых населеных пунктаў як у гандлёвым аб'екце, так і ў кол-цэнтры. Пры напаўненні аўталавак прыярытэт аддаецца таварам айчыннай вытворчасці, удзельная вага іх у агульным аб'ёме рознічнага тавараабароту складае звыш 90 працэнтаў.

Напярэдадні Новага года і Раства ў стацыянарных і перасоўных аб'ектах гандлю актыўна ствараюцца неабходныя запасы харчовых і нехарчовых тавараў, каб у поўнай меры задаволіць пакупніцкі попыт, арганізоўваюцца кірмашы, дэгустацыі, рэкламныя зніжкі.

Каб пабачыць усё гэта на свае вочы, разам з **вядучым таваразнаўцам УП «Полацкі рынак г. Віцебска» Юліяй ХАЛЕЙКАЙ і вядучым таваразнаўцам Віцебскага аблспажыўтаварыства Юліяй ТРУФАНАВАЙ** на гандлёвым дыліжансе мы выпраўляемся ў Віцебскі раён.

### ЧАГО ЖАДАЕ ДУША?

Асартымент аўталаўкі абмежаваны пастановай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ад 19.11.2020 № 74 «Аб пераліку тавараў», дзе вызначаны пазіцыі першай неабходнасці для забеспячэння сельскага насельніцтва. Цана на тавары, якія прывозіць амаль да дому аўталаўка, не адрозніваецца ад цаны ў стацыянарных аб'ектах гандлю аблспажыўтаварыства.

У вёсцы Макарава краму на калёсах сустракаюць... усяго два чалавекі. Хоць па дакументах у гэтым населеным пункце аўталаўка абслугоўвае 35 чалавек. «Вось, бачыце, як бывае! Летам, вядома, пакупнікоў больш за спіс. На зіму дзеці забіраюць пажылых бацькоў у горад, а тым, хто застаўся, прывозяць прадукты блізкія. У зімні перыяд працаваць складана, але трэба», — каменціруе Юлія Халейка.

Вітрына з машыны невялікая, але выбар ёсць. Макаронныя вырабы некалькіх відаў, крупы, шмат розных прыпраў і спецый, каля дзесяці найменняў мясных вырабаў, сала, свініна, тварог, смятана, сыры. З рыбнага асартыменту: скумбрыя халоднага вэнджання, селядзец і імітацыя ікры. Што здзівіла асабіста мяне: аўталаўка прывезла жывых адборных карпаў па прыемнай цане — 7,79 рубля за кілаграм.

Глядзім на садавіну і агародніну: яблыкі беларускія — 2,21 (танней, чым у буйных гандлёвых сетках горада), капуста — 1 рубель за кілаграм, салодкая хурма — 6,85 рубля за кілаграм, клеменціны — 7,15 рубля за кілаграм. «А што наконт памідораў і агуркоў? Не сезон?» — пытаюся ў таваразнаўцы. «Справа ў тым, што цяпер сезон беларускіх памідораў скончыўся, закупачная цана на імпартную агародніну пачынаецца з дзевяці рублёў. Дадаць яшчэ мінімальную гандлёвую надбаўку — і цана для пакупнікоў атрымліваецца вельмі высокая. Такі тавар цяпер не ідзе, але па папярэднім запыце мы пад Новы год абавязкова прывязём і памідоры», — тлумачыць Юлія Халейка.

Вывучаем асартымент далей: чатыры віды чаю, кавы, па некалькі відаў шакаладных і карамельных цукерак, шакаладныя рулеты і бублікі. Ёсць і рыбныя кансервы, алей, мінеральная вада і салодкія газіраваныя напоі, табачныя вырабы і алкагольная прадукцыя.

Жыхарка Макарава Ірына Пятроўна разам з мужам закупляюцца на тыдзень — наступны раз аўталаўка прыедзе ў пятніцу. Таму некалькі булак хлеба, малако, тварог, каўбаса, цукеркі і рулецікі — далёка не ўсё, што змясцілася ў чатырох сумках сям'і. «А што з садавіны смачненькага прывезлі? Хоць мы і на пенсіі, а вітамінаў хочацца», — усміхаецца жанчына. «Клеменціны вельмі смачныя і хурма хрумсткая, не пашкадуеце», — падказвае прадавец Вольга Кузьміна і працягвае праз акенца рыжыя вітаміны. Заўважае жанчына на вітрыне і навагодні падарунак з цукерак па адэкватнай цане — 13,99. «Вазьму ўнуку, пад ёлку пастаўлю», — адзначае пакупніца.

Ірына Пятроўна разам з мужам акцэнтуюць увагу на тым, што работай крамы на калёсах яны задаволены: ёсць усё, што неабходна для жыцця, і нават больш. У ліку невялікай заўвагі адзначаюць тое, што разлічыцца карткай атрымліваецца не заўсёды, але гэта, як тлумачыць прадавец, залежыць ад сувязі, з якой у вёсцы ёсць праблемы. На развітанне пакупнікі просяць наступным разам прывезці вафельныя цукеркі «Аэрафлот» і, калі будзе магчымасць, слабасалёную чырвоную рыбу на святочны стол. А магчымасць будзе: чарговы заказ ужо запісаны прадаўцом у сшытак.

Пасігналіўшы на ўсякі выпадак яшчэ раз, гандлёвы дыліжанс накіроўваецца ў наступную вёску Мяклава, дзе яго ўжо чакаюць чатыры пастаянныя пакупніцы. На шляху ў засыпанае снегам Мяклава Юлія Халейка расказвае, што раней аўталаўка прывозіла некаторае адзенне, тазікі і вёдры, але гэта, па выніках маніторынгаў, не карысталася попытам. Тое самае і з больш шырокім пералікам малочнай і кандытарскай прадукцыі. «Справа ў тым, што за столькі гадоў работы мы ўжо вывучылі пакупніцкі попыт. Наша аўдыторыя — гэта пажылыя людзі, якія звыкліся з тымі ці іншымі прадуктамі і новае каштуюць неахвотна. Менавіта таму ў рыбным асартыменце абавязкова ёсць «Селядзец на перакус», тваражкі «Савушкін», цукеркі «Чарнаморачка» і іншыя пазіцыі, якія штотыдня купляюць вяскоўцы», — расказвае вядучы таваразнавец.

Каля сваіх дамоў аўтакраму чакаюць жанчыны літаральна «залатога» ўзросту. Лідзіі Тарасаўне 93 гады, і як бы дзеці ні хацелі перавезці маці ў горад, яна не згаджаецца: пражыла ў сваім доме 80 гадоў. Зрок ужо падводзіць і здароўе не тое, але кожную пятніцу яна разам з аднавяскоўцамі сустракае аўталаўку. «Я ўсё жыццё адпрацавала настаўніцай, пенсія ў мяне добрая, на ўсё хапае. Бяру сабе цукеркі, пернікі, сардэлькі, вельмі люблю ёгурты. Дзякуй вам, што не забываеце аб нас, старых, нават зімой, дзякуй і Прэзідэнту за тое, што ў нас ёсць свежы хлеб», — звяртаецца да кіраўніцтва жанчына. З ёй згаджаецца і 82-гадовая Тамара Уладзіміраўна. Наконт навагодняга стала жанчыны не перажываюць: усё зробяць дзеці, а вясковыя пакупніцы прыходзяць да аўтакрама па малако і хлеб, і каб пагаманіць.

«У апошні тыдзень перад Новым годам плануеце пашырыць асартымент тавараў?» — пытаюся ў таваразнаўцы. «Канешне, на вітрыне ўжо з'явіліся некалькі відаў падарункаў з цукерак, у рыбную лінейку дададзім яшчэ ікры і слабасалёнай рыбы, пашырым асартымент ігрыстых напояў. Мандарыны і хурма ўжо знаходзяцца ў пастаянным спісе тавараў. Калі трэба, па папярэдняй замове даставім вінаград, бананы і ананасы», — адзначае Юлія Уладзіміраўна. Акрамя гэтага, у пакупнікоў, асабліва напярэдадні свята, карыстаецца попытам прадукцыя ўласнай вытворчасці ўнітарнага прадпрыемства: квашаная капуста, каўбаскі, галубцы, руляды.

### ПРА ЛЮДЗЕЙ І ТРАКТАР

Ва ўнітарным прадпрыемстве «Полацкі рынак г. Віцебска» некалькі сельсаветаў Віцебскага раёна абслугоўваюць дзве аўтакрамы, гэта каля 30 населеных пунктаў з 821 жыхаром. І амаль усе яны — людзі пастаянныя і добравядомыя экіпажам крам на калёсах. Жанчыны-прадаўцы заўсёды на сувязі з насельніцтвам, прымаюць замовы не толькі ўжывую, але і па тэлефоне. Аўталаўка прывозіць вяскоўцам нават камбікорм для жывёлы.

За дзень перасоўны гандлёвы аб'ект намотвае сотні кіламетраў па часам непраязных дарогах, а зімой вядомыя маршруты ўскладняюцца снегападамі. Кіроўцы знаходзяцца на пастаяннай сувязі са старшынямі сельскіх Саветаў, каб трактар дапамог выцягнуць машыну са снегу. Пасля моцнай завірухі бывала і такое, што трактар цэлы дзень ездзіў разам з аўтакрамай. Але, нягледзячы на ўсе цяжкасці гэтай галіны гандлю, работнікі аблспажыўтаварыства ставяцца з клопатам і ўвагай да кожнага жыхара населенага пункта, які абслугоўваюць. Часта крама на калёсах спыняецца каля хаты, дзе жывуць зусім старыя людзі, і сігналіць. А калі прадавец ведае, што падапечны захварэў, а яму ўсё роўна патрэбны прадукты, нясе сумкі да пакупніка сам. І гэтая чалавечая чуласць, на мой погляд, з'яўляецца адным з нямногіх фактараў таго, што глухія вёскі яшчэ жывуць.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,**
**фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### На паўночным захадзе Пакістана ў выніку атакі тэрарыстаў на паліцэйскі ўчастак загінулі 23 афіцэры




Тэрарыст-смяротнік падарваў свой аўтамабіль, зараджаны ўзрыўчаткай, каля галоўнага ўваходу ў паліцэйскі ўчастак на паўночным захадзе Пакістана. Загінулі сама меней 23 афіцэры, паранены яшчэ 32, паведаміла Associated Press. У афіцыйнай заяве сказана, што шэсць баевікоў адкрылі агонь, пачалася перастрэлка, якая працягвалася некалькі гадзін. Мясцовая паліцыя пацвердзіла, што ўсе шэсць тэрарыстаў былі забіты. Целы 23 загінулых афіцэраў былі перададзены ў бальніцу, сказаў журналістам старшы паліцэйскі Махамад Аднан. Атака была накіравана на паліцэйскі ўчастак Дарабан у Дэра-Ісмаіл-Хан, горадзе ў правінцыі Хайбер-Пахтунхва, якая мяжуе з Афганістанам, паведаміў мясцовы афіцэр Камал. Гэтая правінцыя з'яўляецца былой апорай баевікоў пакістанскага руху «Талібан». Прэзідэнт Пакістана Арыф Альві асудзіў атаку і выказаў спачуванні сем'ям пацярпелых.

### У Мадрыдзе работнікі супермаркетаў плануюць забастоўку напярэдадні Каляд і Новага года



Прафсаюз Усеагульнага саюза працоўных Іспаніі (UGT) аб'явіў аб правядзенні чатырохдзённай забастоўкі напярэдадні свят. Аб гэтым паведаміла выданне El Espanol. Правядзенне забастоўкі запланавана на 23, 24, 30 і 31 снежня. Па словах прадстаўніка прафсаюза, заклік да забастоўкі выкліканы беспаспяховымі спробамі перагавораў па калектыўным дагаворы аб гандлі прадуктамі харчавання ў рэгіёне. Асноўная мэта — павысіць заработную плату работнікаў гэтага сектара, асабліва тых, хто атрымлівае менш за мінімальную заработную плату. Забастоўка закране найбуйнейшыя сеткі супермаркетаў, а таксама традыцыйныя рынкі, гандлёвыя галерэі і вулічныя крамы, якія спецыялізуюцца на гандлі прадуктамі.

### Bosch скароціць 1,5 тысячы рабочых месцаў на двух прадпрыемствах

Нямецкая інжынерная і тэхналагічная кампанія Robert Bosch GmbH плануе скараціць да 1,5 тысячы рабочых месцаў на двух прадпрыемствах у ФРГ да канца 2025 года. Гэта будзе зроблена, каб адаптаваць штат супрацоўнікаў да змен попыту і аб'ёмаў заказаў у аўтамабільным сектары, а таксама да ўкаранення новых тэхналогій. Як адзначаецца ў паведамленні Bosch, скарачэнні закрануць рабочыя месцы ў галіне распрацоўкі і продажаў, а таксама адміністрацыйнага персаналу ў кампусах кампаніі ў Феербаху і Швібердынгене. Кампанія плануе вырашыць праблему скарачэння за кошт рэлакацыі персаналу, а таксама пагадненняў аб датэрміновым выхадзе на пенсію або добраахвотным звальненні, паведаміла прадстаўнік Bosch газеце The Wall Street Journal. У кампаніі адзначаюць, што ў пачатку наступнага года яна можа сутыкнуцца са значна больш сур'ёзнымі праблемамі, чым чакалася раней.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# ДЫЯТАМІТ

## Што гэта такое і як яго ўжываюць у садоўніцтве

Дасведчаныя агароднікі ведаюць, што аснова здаровых і моцных раслін — добрая глеба. Каб скласці ідэальную глебасумесь, садоўнікі выкарыстоўваюць розныя складнікі. Дыятаміт у садоўніцтве адносна новы прадукт — экалагічны, даступны і карысны.

Дыятаміт (дыятамітавая зямля, горная мука, кізельгур) — гэта асадачная горная парода, якая складаецца з закамянелых астанкаў дыятомавага багавіння. Здабываюць яго як карысны выкапень.

Састаў дыятаміту вар'іруецца ў залежнасці ад месца яго ўтварэння, аднак звычайна ён змяшчае 75—85 % крэменязёму (дыяксіду крэмнію).

Дыятаміт хімічна практычна інертны. Не раствараецца ў вадзе і арганічных растваральніках. Яго адрозніваюць гіграскапічнасць (лёгка ўбірае вільгаць у 20-40 разоў больш сваёй вагі), здольнасць адсарбоўваць і ўтрымліваць пахі, нізкая цеплаправоднасць, абразіўныя ўласцівасці.

Шматлікія даследаванні пацвярджаюць, што ўжыванне дыяматту дабратворна адбіваецца на глебе — яна становіцца порыстай і водапранікальнай. Часцінкі кізельгуру ўбіраюць ваду і растворы ў ёй рэчывы, а пасля паступова аддаюць раслінам. Гэта дазваляе паліваць радзей, пры гэтым лягчэй пазбегнуць рэзкіх перападаў вільготнасці. Валодаючы цеплаізаляцыйнымі ўласцівасцямі, дыятаміт абараняе каранёвую сістэму раслін ад рэзкіх перападаў тэмпературы.

Дыятаміт можна разглядаць у якасці бездакорнай крыніцы крэмнію. Расліны, якія атрымлівалі крэмній у неабходных колькасцях, станавіліся больш стрэсаўстойлівымі. Яны актыўна супраціўляліся хваробам, нападам шкоднікаў, неспрыяльным кліматычным умовам і нават прысутнасці цяжкіх металаў у паветры і глебе.



Па меркаванні некаторых навукоўцаў, дыятамітам можна часткова ці цалкам замяніць пестыцыды, бо ён натуральным чынам будзе стымуляваць прыродныя ахоўныя рэакцыі раслін на любы стрэс.

### Для вырошчвання расады

Дыятаміт выкарыстоўваюць для паляпшэння ўласцівасцяў глебы, а таксама з мэтай прадухіліць з'яўленне цвілі ў міні-парнічках або на паверхні глебы ў чыгунах. Глеба, узбагачаная дыятамітам, перашкаджае развіццю патагенаў грыбной прыроды, напрыклад тых, што выклікаюць чорную ножку. Пры падрыхтоўцы глебасумесі для расады на 4-5 частак грунту бяруць 1 частку дыятаміту.

### У пакаёвым кветкаводстве

Дыятаміт ужываюць у якасці глебапаляпшальніка і для вырошчвання пакаёвых раслін. Пры складанні глебасумесяў дадаюць 15-20 % гэтага матэрыялу.

### Для паляпшэння глебы на градках

Вядома, што форма і ўласцівасці дыятаміту захоўваюцца нават праз мноства цыклаў замарожвання-размарожвання. Таму яго можна выкарыстоўваць у адкрытым грунце, размяркоўваючы па шматгадовую эфектыўнасць. Дапускаецца ўносіць яго ў глебу на працягу ўсяго перыяду вегетацыі, для гэтага бяруць сярэднюю і буйную фракцыі.

Увесну, да пасадкі раслін, ці пасля ўборкі ўраджаю падчас восеньскай апрацоўкі глебы дыятаміт раўнамерна рассыпаюць па паверхні глебы з разліку 150—250 г/м$^2$ і перакопваюць на штык рыдлёўкі. Падчас вегетацыі раслін яго раўнамерна рассыпаюць па паверхні глебы з разліку 150-200 г/м$^2$ і неглыбока рыхляць.

### Для барацьбы з насякомымі-шкоднікамі

Ужыванне парашку (з памерам часціц не больш за 50 мкм) дыятаміту ў якасці інсектыцыду заснавана на яго абразіўных і сарбцыйных уласцівасцях. З дапамогай парашковага дыятаміту (яго яшчэ называюць харчовым) у хаце можна змагацца з блохамі і прусамі, у садзе — з мурашкамі, каларадскімі жукамі і г. д., прычым як з дарослымі асобінамі, так і з лічынкамі. У продажы існуюць спецыялізаваныя і ўніверсальныя сродкі на базе гэтага рэчыва.

Найбольшы эфект мае апудрыванне парашковым дыятамітам надземнай часткі раслін. Такім чынам змагаюцца, напрыклад, з крыжакветнымі блошкамі і каларадскімі жукамі. Другі варыянт прымянення — апудрыванне глебы міжраддзяў: так пазбаўляюцца ад мурашак і смаўжоў. У сярэднім норма прымянення складае 150 мл на 10 м$^2$.

У пакаёвым кветкаводстве з дапамогай дыятаміту дробнай і сярэдняй фракцый можна паспяхова змагацца са шкоднікамі, у прыватнасці, з глебавымі мошкамі і камарыкамі. Для гэтага здымаюць верхнюю частку грунту (3–5 см) і змешваюць яе з дыятамітам, не шкадуючы апошняга (дадаючы да 80—90 %). Затым грунт вяртаюць у чыгун і засыпаюць паверхню чыстым дыятамітам. Эфект будзе заўважны не адразу: прысутнасць дыятаміту ў верхнім пласце глебы парушыць жыццёвы цыкл насякомых, і паступова яны сыдуць на нішто. Гэты спосаб можна лічыць экалагічнай альтэрнатывай барацьбы са шкоднікамі без ужывання хімікатаў.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.21 | 16.47 | 7.26 |
| Віцебск — | 9.18 | 16.29 | 7.11 |
| Магілёў — | 9.11 | 16.37 | 7.26 |
| Гомель — | 8.59 | 16.42 | 7.43 |
| Гродна — | 9.35 | 17.04 | 7.29 |
| Брэст — | 9.27 | 17.13 | 7.46 |

### Месяц

*Маладзік 13 снежня. Месяц у сузор'і Казярога.*

### Імяніны

*Пр.* Навума.
*К.* Альфрэда, Ізыдара, Яна.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**14 СНЕЖНЯ**

У краіне

**1818** год — беларускі археолаг, фалькларыст і этнограф Зарыян Даленга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі) упершыню атрымаў ад Віленскага ўніверсітэта адкрыты ліст на права правядзення археалагічных раскопак на тэрыторыі Беларусі.

**1905** год — нарадзіўся Мікалай Апанасавіч Дарожкін, беларускі вучоны-міколаг і фітапатолаг, акадэмік НАН Беларусі, Акадэміі сельскагаспадарчых навук Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. З'яўляўся загадчыкам лабараторыі Інстытута сацыялістычнай сельскай гаспадаркі АН Беларусі, таксама працаваў дырэктарам і загадчыкам лабараторыі Беларускага НДІ бульбаводства і плодаагародніцтва, загадчыкам лабараторыі Інстытута эксперыментальнай батанікі імя Купрэвіча АН Беларусі. Аўтар больш за 600 навуковых прац, у тым ліку 23 манаграфій. Навуковыя працы прысвечаны фітапаталогіі сельскагаспадарчых раслін. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.



**1906** год — у Мінску было заснавана беларускае кніжна-выдавецкае таварыства «Мінчук» для выдання і распаўсюджвання беларускіх кніг і газет. Сумесна з выдавецтвам «Наша ніва» выдала кірыліцай і лацінкай апавяданне Э. Ажэшкі «Гедалі», рыхтавала да друку «Жалейку» Я. Купалы. Закрыта ў 1907 годзе з-за адсутнасці сродкаў.

**1943** год — адбылася Навагарадоцкая бітва — 425-ы партызанскі полк разграміў 1-ы батальён 278-га грэнадзёрскага палка 95-й нямецка-фашысцкай дывізіі ў в. Новы Гарадок Быхаўскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Батальён гітлераўцаў (каля 200 чалавек з бронемашынай, мінамётнай батарэяй і артылерыйскай гарматай) размясціўся ў вёсцы на адпачынак. Партызаны перакрылі ўсе падыходы да яе і ў ноч на 14 снежня пачалі наступленне. Быў знішчаны штаб ворага, гаражы з аўтамабілямі, склады, захоплены штабныя дакументы, зброя, боепрыпасы, амуніцыя і харчаванне.

У свеце

**1503** год — нарадзіўся Настрадамус (Мішэль Нотрдам), французскі ўрач і астролаг, лейб-медык Карла IX. Аўтар «Стагоддзяў» («Цэнтурый»), якія змяшчалі прадказанні будучых падзей еўрапейскай гісторыі.

**1825** год — паўстанне дзекабрыстаў, спроба дзяржаўнага перавароту, якая адбылася ў Пецярбургу, сталіцы Расійскай імперыі. Паўстанне было арганізавана групай дваран-аднадумцаў, многія з іх былі афіцэрамі гвардыі. Яны паспрабавалі выкарыстаць гвардзейскія часці для недапушчэння ўступлення на трон чарговага імператара Мікалая І. Мэтай змоўшчыкаў было скасаванне самадзяржаўя і адмена прыгоннага права. Паўстанне было падаўлена, зачыншчыкі пакараны смерцю або адпраўлены ў пажыццёвую ссылку.

Так гаварыў...

**АБУЛЬ-ФАРАДЖ:**

*«Ежа, якую арганізм не пераварвае, з'ядае таго, хто яе з'еў».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Сцеражыцеся ашуканцаў! Перад святамі замовіў жонцы духі ад «Шанэль» і залатыя завушніцы, а даслалі два спінінгі і крэселка для рыбалкі.**

Кожны раз, калі штосьці купляю, у мяне з карты спісваюцца грошы. Хто-небудзь ведае, як адключыць гэтую функцыю? Вельмі раздражняе.

**Бландзінка расказвае сяброўкам:**

**— А я ўчора вырашыла дапамагчы бацькам! Прыняла ванну, зрабіла прычоску, манікюр, педыкюр, макіяж, надзела новую сукенку — і пайшла шукаць ім зяця...**

— Людзі, якія ў мяне вочы?
— Сінія.
— Як мора?
— Не, як алкашы!




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.



прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.312. Індэкс 63850. Зак. № 2963.

Нумар падпісаны ў 19.30 13 снежня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12